

ТАІНСТВА ХРЫШЧЭННЯ

Сямейная газета

МАНІПУЛЯЦЫЯ: ТАКТ І ТАКТЫКА

Сямейная газета



Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

17 ЛЮТАГА 2022 г. ЧАЦВЕР № 32 (29654)

# Крыніца радасці



Побач са сталічным пасёлкам Ждановічы на рацэ Свіслач зімуе вялікая чарада вадаплаўных — лебедзяў і качак. Гэтую мясціну неафіцыйна называюць Крыніцай. Кожныя выхадныя сюды, асабліва ў маразы, прыязджаюць дзясяткі мінчан, каб паглядзець на статных птушак, пакарміць іх і, вядома ж, зрабіць сэлфі. У мінулую нядзелю і мне выпала апынуцца на тым беразе, паназіраць і за людзьмі, і за птушкамі, якія з'яўляюцца сапраўднай крыніцай радасці.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## ЛІЧБА ДНЯ

**102 працэнты**

*да ўзроўню 2020 года склалі рэальныя наяўныя грашовыя даходы насельніцтва ў 2021 годзе, паведаміў Нацыянальны статыстычны камітэт. У агульным аб'ёме грашовых даходаў аплата працы займае 65,1 працэнта, даходы ад прадпрымальніцкай і іншай дзейнасці, якая прыносіць даход, — 7,8 працэнта, трансферты насельніцтву (пенсіі, дапамогі, стыпендыі і іншыя трансферты насельніцтву) — 22,7 працэнта, даходы ад уласнасці і іншыя даходы — 4,4 %. Рэальныя наяўныя грашовыя даходы насельніцтва — грашовыя даходы за вылікам падаткаў, збораў і ўзносаў, скарэктаваныя на індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі.*

## КОРАТКА

- Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка зробіць візіт у Расію. Плануецца, што ў Маскве 18 лютага адбудуцца перагаворы з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным. Кіраўнікі дзяржаў на сустрэчы абмяркуюць шырокае кола пытанняў.
- **Выстава вырабаў народнай творчасці адкрыецца ў Нацыянальнай бібліятэцы. З усіх рэгіёнаў Беларусі ў сталіцу прывезлі работы больш як за сто майстроў народнай творчасці.**
- Фінал праекта «100 ідэй для Беларусі» адбудзецца 22 лютага.
- **Продаж квіткоў на «Славянскі базар у Віцебску» стартуе 18 лютага. Афлайн-продаж пачнецца ў абласным цэнтры ў касах ЦК «Віцебск».**
- Аранжавы ўзровень небяспекі аб'яўлены ў Беларусі на сёння з-за моцнага ветру.

ISSN 1990 — 763X

Лічбавізацыя

## Папяровы і пластыкавы

### Біяметрычныя дакументы і электроннае ўзаемадзеянне



**Восем відаў дакументаў новага пакалення, якія сведчаць асобу, пачалі выдавацца восенню ў Беларусі. З таго часу выдадзена ўжо звыш 45 тысяч ID-картак і ID-відаў на жыхарства, а таксама больш як 21 тысяча біяметрычных пашпартоў выключна для выезду за мяжу. З дапамогай ID-карткі летась беларусы атрымалі больш як 17,5 мільёна электронных паслуг і адміністрацыйных працэдур. Найбольш запатрабаванымі ў людзей сталі дазволы на наведванне памежнай зоны, удакладненне інфармацыі аб ільготах і пенсіённым забеспячэнні, падача дэкларацый.**

СТАР. 4

Спадчына

## У СЛАЎГАРАДЗЕ СТВАРАЮЦЬ ПАРК ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ

### Знакавае месца над Сожам можа стаць адным з найцікавейшых у Беларусі музеем пад адкрытым небам

**Праект пакуль толькі абмяркоўваецца, але зразумела адно: у горадзе з амаль 900-гадовай гісторыяй з'явіцца ўнікальная лакацыя, дзе ажывуць разам усе эпохі яго мінулага. За стагоддзі свайго існавання старажытны Прапойск (пасля вайны яго імя змянілася на больш мілагучнае — Слаўгарад) не раз станавіўся цэнтрам цікавых падзей з удзелам вядомых гістарычных асоб. На жаль, архітэктурных сведкаў тых слаўных гадоў у горадзе няма, але ёсць старадаўні парк, адкуль, уласна, і пачыналася яго славутая гісторыя. Менавіта ён і стане цэнтрам пераўтварэнняў.**



Фота Нэлі ЗІГУЛІ.

СТАР. 15

Уладзімір МАКЕЙ:

Знешняя палітыка

# «Мы зацікаўлены ў супрацоўніцтве з тымі краінамі, якія для нас адчыняюць дзверы»

**Міністр замежных спраў Уладзімір МАКЕЙ правёў учора сустрэчу з журналістамі, дзе расказаў, каму выгадна нагнятанне сітуацыі вакол ваенных вучэнняў Расіі і Беларусі, ці застанецца расійская ваенная тэхніка ў Беларусі, што робіцца для зняцця санкцый з авіякампаніі «Белавія» і як заменіць прыбалтыйскі напрамак у перапраўцы калійных угнаенняў.**



Фота БелТА.

## «Беларусь не адыходзіла ад сяброўскай лініі ў адносінах з Украінай»

Міністр пачаў з жарту, згадаўшы інфармацыю розных заходніх СМІ аб тым, што менавіта 16 лютага з тэрыторыі Беларусі нібыта павінна была пачацца агрэсія ў дачыненні да адной суседняй краіны.

— Мы запрасілі вас на гэта мерапрыемства два тыдні назад, паколькі ведалі ўсё загадзя. І будзем цяпер гэта абмяркоўваць, — пажартаваў міністр.

Тэма адносін з Украінай, у тым ліку і ў кантэксце ваенных вучэнняў, якія Расія і Беларусь праводзяць цяпер, разглядалася падчас сустрэчы неаднойчы.

Уладзімір Макей падкрэсліў, што Беларусь ніколі не адыходзіла ад дружалюбнай лініі ў адносінах з Украінай і разглядае яе як важнага гандлёва-эканамічнага партнёра, а яе грамадзян — як брацкі народ.

— Не мы былі ініцыятарамі пагаршэння адносін з нашай паўднёвай суседкай. Ініцыятарам быў другі бок. Пры гэтым для нас было дзіўна, калі гэты другі бок бег наперадзе планеты ўсёй і ініцыяваў шэраг крокаў, звязаных з прыняццем нейкіх дэструктыўных мер у дачыненні да Беларусі, нават хутчэй, чым Еўрапейскі саюз, — адзначыў міністр.

Ён падкрэсліў, што ні санкцыйная, ні гарачая вайна нікому нявыгадныя.

— Я не думаю, што камусьці выгадныя любыя дзеянні, што прывядуць да гарачай фазы вайны. Перакананы: ні Маскве, ні Мінску, ні Кіеву гэта нявыгадна. Магчыма, гэта выгадна тым, хто знаходзіцца страшна далёка адсюль, — заўважыў Уладзімір Макей. — Кіраўніцтва Беларусі, асабіста Прэзідэнт Лукашэнка, катэгарычна выступала супраць якіх-небудзь дзеянняў, што маглі б прывесці да напружаных адносін як паміж нашай краінай і суседнімі дзяржавамі, так і іншымі дзяржавамі.

## Прыярытэты пераасэнсаваны

Звяртаючыся да вынікаў мінулага года, Уладзімір Макей адзначыў, што Беларусь канцэптуальна пераасэнсавала знешнепалітычныя і знешнеэканамічныя прыярытэты.

— Дэстабілізацыя сферы міжнароднай бяспекі, сур'ёзнае абвастрэнне ваенна-палітычнай абстаноўкі ў рэгіёне, ініцыятыўнае і неабгрунтаванае нарошчванне кантынгентаў замежных войскаў і ўзбраенняў у непасрэднай блізкасці ад нашых граніц вымусілі нас у мінулым годзе сумесна з Расіяй і іншымі партнёрамі па АДКБ удзяліць самую пільную ўвагу ўмацаванню абараназдольнасці краіны. Менавіта на фоне згаданых выклікаў і пагроз, па сутнасці, адбылося канцэптуальнае пераасэнсаванне нашых знешнепалітычных і знешнеэканамічных прыярытэтаў.

Паводле яго слоў, зніжэнне ўзроўню і інтэнсіўнасці адносін з асобнымі краінамі і рэгіёнамі Беларусь кампенсуе нарошчваннем узаемадзеяння з тымі дзяржавамі і аб'яднаннямі, якія гатовы супрацоўнічаць на аснове ўзаемнай павагі і раўнапраўя. Так, летась удалося істотна актывізаваць супрацоўніцтва ў Саюзнай дзяржаве, па лініі ЕАЭС і СНД. Працягнута нарошчванне ўзаемадзеяння па шырокім коле пытанняў з Кітаем, актывізавана работа з іншымі дзяржавамі далёкай дугі.

У той жа час у адказ на недружалюбныя дзеянні Еўрасаюза Беларусь была вымушана прыняць меры: прыпынены ўдзел у ініцыятыве «Усходняе партнёрства», абмежаваны імпарт прадукцыі з некаторых краін, зроблены сіметрычныя крокі ў візавай сферы.

## Абмежаванні ў адносінах «Белавія» беспадстаўныя

Абмежаванні адносна авіякампаніі «Белавія» абсалютна беспадстаўныя і неразумныя, лічыць Уладзімір Макей. Канфлікт, нагадаем, узнік пасля інцыдэнту з самалётам Ryanair у маі 2021 года. Пасля гэтага шэраг краін забаранілі палёты беларускіх самалётаў над сваёй тэрыторыяй.

— Мы бачым спробы заходніх краін аказаць уплыў на ІСАО для таго, каб ІСАО падрыхтавала адпаведнае выгаднае для іх заключэнне. Мы катэгарычна не прымаем гэта, працуем з членамі ІСАО, нашымі партнёрамі. Натуральна, будзем адсочваць сітуацыю і рабіць захады па зняцці неабгрунтаваных абмежаванняў супраць нашай авіякампаніі. Абсалютна беспадстаўныя, неабгрунтаваныя, дурныя рашэнні, — сказаў кіраўнік МЗС. — Калі ІСАО не адменіць гэтае рашэнне, то для нас гэта будзе сур'ёзны паказчык, прычым не толькі для нас — для ўсіх, што палітызацыя пытання адбываецца ўжо ў адносінах да тых палажэнняў, якіх гэта не датычыцца. Я маю на ўвазе палажэнне аб авіяцыйнай бяспецы. Там палітыка не павінна прысутнічаць. Бо гэта звязана з жыццём людзей, пасажыраў.

Кіраўнік МЗС нагадаў: беларускі бок першапачаткова заяўляў аб тым, што санкцыі адносна «Белавіі» абсалютна неапраўданыя і супярэчаць усім міжнародным пагадненням і дакументам.

## Беларусь катэгарычна супраць пашырэння НАТА

Міністр адзначыў, што стаўленне да пашырэння НАТА агульнавядомае. Яно аб'яўлялася яшчэ ў пачатку 1990-х гадоў.

— Мы заўсёды выступалі катэгарычна супраць пашырэння НАТА. Лічым, што тыя абяцанні, якія ў свой час былі дадзены Гарбачову, заходнімі партнёрамі парушаны. У выніку мы маем сітуацыю, якую маем, калі ніхто нікому не давярае, калі ўсе падзелены на «нашых» і «нянашых» і калі такія пляцоўкі, як Пастаянны савет АБСЕ, Савет Бяспекі ААН, ператварыліся толькі ў поле бітвы, — адзначыў Уладзімір Макей.

Ён падкрэсліў, што небяспечна губляць «дух Сан-Францыска, калі стваралася Арганізацыя Аб'яднаных Нацый».

— Калі, нягледзячы на вялізныя палітычныя рознагалоссі, супярэчнасці, якія існавалі ў той час, кіраўнікі дзяржаў, якія знаходзяцца па розныя бакі барыкад, тым не менш, прынялі рашэнне аб стварэнні гэтай арганізацыі. Сёння гэты дух Сан-Францыска страчаны. І, больш за тое, з-за таго, што мы назіраем інфантылізм у палітыцы шэрагу заходніх кіраўнікоў, не можам знайсці нават нейкія мінімальныя кропкі для судакранання, дыялогу. Сёння гэта вельмі важна і неабходна, — перакананы Уладзімір Макей.

## Беларусь будзе выкарыстоўваць расійскія парты

Пасля адмовы прыбалтыйскіх суседзяў ад перавалкі беларускіх грузаў у іх партах Беларусь задзейнічае расійскую інфраструктуру.

— Вядзецца канкрэтная работа, каб актыўна задзейнічаць расійскія парты для перавалкі беларускіх грузаў. Гэта і падстрахоўка на будучыню. Хоць я перакананы, што рана ці позна сітуацыя і на заходнім напрамку нармалізуецца. Але калі нашы партнёры не хочуць гэтага, то мы павінны рабіць адпаведныя захады, каб нейтралізаваць негатыўныя наступствы для нас, — сказаў Уладзімір Макей.

Паводле яго слоў, з расійскім бокам ужо дасягнуты дамоўленасці, работа працягваецца.

— Зразумела, што гэта не аднадзённы працэс. Выхад на максімальна эфектыўныя вынікі запатрабуе вызначанага часу, высілкаў і фінансавых сродкаў. Цяпер нашы спецыялісты займаюцца гэтымі пытаннямі, — адзначыў міністр.

## Беларусь і Кітай: далейшаму супрацоўніцтву быць

— Мы цяпер працуем над арганізацыяй прамых кантактаў нашых кіраўнікоў. Думаю, што ў ходзе маючых адбыцца кантактаў нашы кіраўнікі абмяркуюць шэраг важных пытанняў, якія прывядуць да далейшага паглыблення і ўмацавання нашага супрацоўніцтва, — сказаў Уладзімір Макей. — Мы зацікаўлены ў супрацоўніцтве з тымі краінамі, якія для нас адчыняюць дзверы. Цяпер абмяркоўваецца шэраг канкрэтных праектаў, звязаных з далейшым адкрыццём кітайскага рынку для нашых тавараў. Гэта сельскагаспадарчая і прамысловая прадукцыя.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У Швецыі вырашылі пытанне з уступленнем у НАТА

**Улады Швецыі не стануць накіроўваць заяўку на ўступленне ў НАТА, інфармацыю пацвердзіла міністр замежных спраў краіны Ан Ліндэ. Аб гэтым паведамляе ТАСС са спасылкай на знешнепалітычную дэкларацыю 2022 года.**



«Урад не мае намеру падаваць заяўку на членства ў НАТА. Шведская палітыка бяспекі застаецца нязменнай», — падкрэсліла кіраўнік МЗС падчас выступлення ў парламенце.

Паводле яе слоў, свабода ад ваенных альянсаў прыводзіць да бяспекі і стабільнасці ў Паўночнай Еўропе. Як лічыць Ліндэ, гэты курс мае на ўвазе актыўную, шырокую, а таксама адказную палітыку бяспекі і знешнюю палітыку. Усе ўмовы выконваюцца, як заўважыла міністр, пры спалучэнні з паглыбленнем абароннага супрацоўніцтва. У прадстаўленай дэкларацыі Швецыі не фігуруе «опцыя Паўночнаатлантычнага альянсу».

Таксама ў Стакгольма застаецца права на тое, каб падаць заяўку на ўключэнне ў склад НАТА пазней.

## Байдэн: санкцыі супраць Расіі могуць ударыць па ЗША і прывесці да росту цэн на паліва

**Магчымае ўвядзенне новых санкцый Захаду супраць Расіі можа ўдарыць па ЗША і прывесці да росту цэн на паліва. Пра гэта заявіў прэзідэнт ЗША Джо Байдэн, выступаючы ў Белым доме, паведамляе ТАСС.**

«Я не буду прыкідвацца, што гэта будзе не балюча. Гэта можа адбіцца на цэнах у энергетычнай сферы. Так што мы робім актыўныя крокі, каб аблегчыць ціск на нашы энергетычныя рынкі і супрацьдзейнічаць росту цэн шляхам каардынацыі з найбуйнейшымі пастаўшчыкамі і спажыўцамі энергіі, каб задзейнічаць усе інструменты, якія маюцца ў нашым распараджэнні, і дапамагчы з цэнамі на бензін», — сказаў Джо Байдэн.

«Але амерыканскі народ разумее, што за абарону дэмакратыі і свабоды даводзіцца плаціць. Гэта справа, якая аб'ядноўвае і рэспубліканцаў, і дэмакратаў», — заявіў прэзідэнт ЗША.

Па словах кіраўніка Белага дома, краіны Захаду ўвядуць супраць Расіі санкцыі ў сферы экспартнага кантролю і фінансаў у выпадку агрэсіі супраць Украіны, а таксама не дапусцяць пачатку работы трубаправода «Паўночны паток — 2».

Апошнім часам у краінах Захаду, а таксама ва Украіне гучаць сцвярджэнні аб магчымым уварванні Расіі на ўкраінскую тэрыторыю. Прэс-сакратар прэзідэнта Расіі Дзмітрый Пяскоў назваў такую інфармацыю пустым і беспадстаўным нагнятаннем напружанасці. Пяскоў падкрэсліў, што Расія ні для каго не складае пагрозы. Пры гэтым ён не выключыў магчымасці правакацый, каб апраўдаць такія заявы, і папярэдзіў, што спробы сілавога вырашэння крызісу на паўднёвым усходзе Украіны будуць мець самыя сур'ёзныя наступствы.

## Інфляцыя ў Вялікабрытаніі дасягнула 30-гадовага максімуму

**Спажывецкія цэны выраслі на 5,5 % за 12 месяцаў, піша The Guardian са спасылкай на даныя Нацыянальнай статыстычнай службы краіны.**

Гэта самае высокае значэнне з сакавіка 1992 года, калі інфляцыя была 7,1 %. Найбольшы ўклад у рост інфляцыі за апошні год унеслі высокія цэны на электраэнергію, транспартныя расходы, адзенне, абутак, жыллё, мэблю і тавары для дому. У гэтым месяцы Банк Англіі папярэдзіў, што інфляцыя спажывецкіх цэн можа дасягнуць піка прыкладна ў 7,25 % да красавіка, паколькі цэны на энерганосьбіты, якія растуць, уплываюць на спажыўцоў.

Як паведамляе Forbes, рост інфляцыі сёння — агульнасусветная тэндэнцыя. У ЗША інфляцыя да канца 2021 года склала 7 % — самы высокі паказчык з 1982 года. Гадавы рост спажывецкіх цэн у 38 краінах Арганізацыі эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця (АЭСР) у лістападзе дасягнуў 5,8 працэнта — максімум з мая 1996 года. У еўразоне індэкс цэн у снежні паскорыў рост да 5 % — максімальны ўзровень з моманту ўвядзення еўра.

# «Усё ідзе ў штатным рэжыме»

**У Беларусі людзі праяўляюць даволі вялікую цікавасць да рэферэндуму па ўнясенні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю. Аб гэтым заявіў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА на сустрэчы з гаспадарчым актывам Пінскага раёна, паведамляе БелТА.**

«Застаўся тыдзень да пачатку датэрміновага галасавання. Праводзіцца актыўная работа ва ўсіх кутках нашай краіны, жывое абмеркаванне ў калектывах. Бачым даволі высокую цікавасць насельніцтва да рэферэндуму. Упэўнены, што ён пройдзе ў канструктыўным рэчышчы і людзі яго падтрымаюць. Пра гэта гавораць і сацыялагічныя даследаванні, — сказаў Ігар Сергеенка.


Фота БелТА.

— Створаны камісіі рознага ўзроўню, усе пытанні адпрацаваныя. Усё ідзе ў штатным рэжыме».

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта дадаў: падрыхтоўчая работа да рэферэндуму практычна завершана. «Абстаноўка ў краіне спакойная, стабільная, абсалютна кіруемая. Прымаюцца меры для забеспячэння бяспекі выбарчых камісій. Усе нашы людзі будуць адназначна абароненыя, — падкрэсліў ён. — Бачым, што палітэмігранцкія цэнтры за мяжой у асобе збеглых спрабуюць уплываць на абстаноўку. Разглядаюць перыяд падрыхтоўкі як апошні шанц яе дэстабілізаваць, узмацніць палітызацыю грамадства, радыкалізаваць настроі. Нельга выключаць рознага кшталту правакацый на выбарчых участках».

Ігар Сергеенка звярнуў увагу на тое, што пры абмеркаванні змяненняў у Канстытуцыю людзей у першую чаргу цікавяць мясцовыя пытанні, якія ім больш блізкія. «Канстытуцыя — гэта дакумент на дзесяцігоддзі. З яе будуць вынікаць іншыя законы, якія будуць накіраваныя на вырашэнне задач па канкрэтных напрамках», — адзначыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Ігар Сергеенка падзяліўся, што Канстытуцыйная камісія правяла вялікую работу па падрыхтоўцы змяненняў і дапаўненняў у праект Асноўнага Закона. «Дастаткова складаная і карпатлівая работа — спрэчкі, доказванне той ці іншай пазіцыі — гэта адымала значную частку часу, душэўных сіл і здароўя. Змяненні ў Канстытуцыю абгрунтаваныя тым, што за гэты час памяняўся свет, геапалітычная сітуацыя. Дынамічна развіваюцца ўсе сферы нашага грамадства. Захоўваецца запыт на захаванне нацыянальнага суверэнітэту, ён дастаткова высокі сёння».

# МАЛАДАЯ СІЛА БУДУЕ МАРЫ

## Як новы артыкул Канстытуцыі ўвасабляецца ў працоўным маладзёжным руху

**Аддаць свой голас на рэспубліканскім рэферэндуме — гэта не толькі пра імкненне выканаць грамадзянскі абавязак, але і пра асэнсаванае жаданне зрабіць свой выбар дзеля будучыні — нашай і нашых дзяцей. Развіццю патэнцыялу моладзі як рэсурсу, актыву беларускай нацыі ў праекце змяненняў Канстытуцыі прысвечаны новы асобны артыкул 321.**

**Ён замацоўвае правы маладога пакалення на стварэнне на самым высокім узроўні ўсіх умоў для духоўнага, маральнага, інтэлектуальнага і фізічнага росту. Галоўны курс — на рэалізацыю патэнцыялу моладзі ў інтарэсах усяго грамадства.**

### Сканцэнтраваць намаганні на канкрэтных справах

— Хлопцы і дзяўчаты, студэнты, спецыялісты-пачаткоўцы, якія цяпер прайшлі школу рэспубліканскіх, абласных маладзёжных будоўляў, прыйдуць на рэспубліканскі рэферэндум ужо свядомымі дарослымі людзьмі, — упэўнены **старшыня Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў будаўніцтва і прамысловасці будаўнічых матэрыялаў, першы сакратар Гомельскай абласной арганізацыі Камуністычнай партыі Беларусі Дзмітрый МУРАШКА.**

Па яго словах, у апошнія гады на Гомельшчыне ў лідарах па колькасці байцоў у студэнцкіх атрадаў — атрады будаўнічага профілю. Гомельскія будаўнікі адклікаюцца на ўсе ініцыятывы моладзі па аказанні дапамогі пры ўзвядзенні сацыяльна значных аб'ектаў. Ім у рэгіёне прысвойваецца статус абласной маладзёжнай будоўлі. У розныя гады гэта былі цэхі Беларускага металургічнага завода, дзіцячая абласная клінічная бальніца ў Гомелі. Моладзь дапамагала ў рэканструкцыі помніка камсамольцам-падпольшчыкам у Гомелі, удзельнічала ва ўзвядзенні мемарыяльнага комплексу героям Днепроўскай бітвы ў Лоеве. У 2020 годзе менавіта маладзёжныя сілы дапамаглі будаўнікам Гомельшчыны ў рэкордныя тэрміны справіцца з двума вельмі значнымі аб'ектамі.

### Выконваем адну задачу

— Абласнымі маладзёжнымі будоўлямі былі аб'яўлены школа ў мікрараёне № 21 Гомеля і рэканструкцыя брацкага пахавання на месцы спаленай вёскі Ала ў Светлагорскім раёне, — расказвае Дзмітрый Мурашка. — Дарэчы, гэтыя два будаб'екты пачалі актыўна рэалізоўвацца непасрэдна пры падтрымцы кіраўніка дзяржавы. Аднаўленне будаўніцтва даўгабуда — сярэдняй школы ў 21-м мікрараёне Гомеля — пачалося пасля агучвання праблемы падчас акцыі «Ваша пытанне Прэзідэнту». Спрыяльныя ўмовы надвор'я дазволілі фарсіраваць будаўніча-мантажныя работы нават у зімовых месяцы. Гэтая пляцоўка была аб'яўлена абласной маладзёжнай будоўляй. На ёй працавалі юнакі з профільнага будатрада БРСМ, самыя актыўныя і ініцыятыўныя студэнты будаўнічых спецыяльнасцяў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту. Рабяты атрымалі першы вопыт работы на вытворчасці.

Старшыня прафсаюза будаўнікоў рэгіёна нагадвае, што пытанне аб неабходнасці стварэння мемарыяла ў Але таксама было агучана на сустрэчы з Прэзідэнтам. Аляксандр Лукашэнка ініцыятыву падтрымаў. Стварэнне архітэктурнай канцэпцыі «Ала» даручылі групе архітэктараў Інстытута «Гомельграмадзянпраект».

— Для гомельскіх будаўнікоў гэты аб'ект стаў сапраўды выклікам. Пры гэтым, калі наша моладзь папрацавала ў будатрадах на такіх пляцоўках, яна разумее, — так, мы — ад Прэзідэнта да байца студатрада — выконваем адну задачу, — упэўнены Дзмітрый Мурашка.

Ён нагадвае, як літаральна ўвесь рэгіён летась сачыў за ўзвядзеннем у Гомелі ўнікальнага адукацыйнага мультыкомплексу. Гаворка пра будаб'ект, які таксама атрымаў статус «Абласная маладзёжная будоўля», — школа ў 96-м мікрараёне абласнога цэнтра, ці «Хутары». Гэтую пляцоўку ахрысцілі адной з самых імклівых будоўляў за ўсю гісторыю рэгіёна. Мікрараён узнік практычна на пустцы, шматпавярховікі тут раслі як грыбы пасля дажджу, а вось новая школа — заставалася марай.


**Старшыня Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў будаўніцтва і прамысловасці будаўнічых матэрыялаў Дзмітрый МУРАШКА.**

### «Уключыцца» ў будучую прафесію

— Узвядзенне сацыяльна важнага і неабходнага ў маладым мікрараёне аб'екта будаўнікі вялі ў кругласутачным рэжыме, — дзеліцца старшыня галіновага прафсаюза. — Галоўны падрадчык, ААТ «Будаўнічы трэст нумар 14» яшчэ на стадыі будаўніцтва даў дазвол на правядзенне на пляцоўцы практычных заняткаў для навучэнцаў Гомельскага дзяржаўнага дарожна-будаўнічага каледжа. Яны на свае вочы ўбачылі працэс узвядзення сацыяльна значнага аб'екта, «уключыліся» ў будучую прафесію.

Акрамя таго, тыя ж навучэнцы пасля выказалі жаданне працаваць на маладзёжнай будоўлі на гэтым аб'екце нароўні з прафесіяналамі. Яны ўзялі ўдзел у будаўніцтве вялікай чашы басейна і значнай часткі работ па добраўпарадкаванні. Папрацавалі на гэтым аб'екце і навучэнцы Гомельскага дзяржаўнага мастацкага каледжа і Гомельскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа народных мастацкіх промыслаў.

— Калі вярнуцца да нашых гомельскіх «хутаранцаў», то мне падаецца, што маладыя бацькі, якія спачатку змаглі пры падтрымцы дзяржавы пабудаваць жыллё ў мікрараёне перспектыўнай забудовы, а пасля атрымалі і магчымасць адправіць сваіх дзяцей у новую суперсучасную школу, таксама свядома прыйдуць на рэферэндум як дарослыя разумныя грамадзяне краіны, — падкрэслівае Дзмітрый Мурашка.


**Будаб'ект «Школа ў 96-м мікрараёне Гомеля» — пляцоўка для практычных заняткаў будучых будаўнікоў.**

### Абарона прафесійных правоў і сацыяльнай справядлівасці

Новы «маладзёжны» артыкул у Асноўным Законе краіны не зможа пакінуць раўнадушнымі і маладых спецыялістаў, якія нядаўна прыйшлі на першае месцы работы, упэўнены Дзмітрый Аляксандравіч:

— На Гомельшчыне летась больш як пяцьсот выпускнікоў сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі атрымала свае першыя рабочыя месцы ў будаўнічых арганізацыях. На прадпрыемствах рэгіёна размеркаваныя і маладыя спецыялісты з дыпломамі ВНУ: інжынеры-будаўнікі, геадэзісты, спецыялісты аддзелаў тэхнічнага кантролю і інжынеры-электроншчыкі. Маладыя спецыялісты добра разумеюць, што атрымаюць абарону сваіх прафесійных, працоўных правоў, могуць разлічваць на сацыяльную справядлівасць у пытаннях арганізацыі і аплаты працы, захаванне грамадскага кантролю за выкананнем заканадаўства. Галоўнае, каб самі належна выконвалі службовыя абавязкі, імкнуліся расці і развівацца. Стымул у гэтым, у тым ліку, — сацыяльная значнасць аб'ектаў, за якія бярэцца іх прадпрыемства.

Дарэчы, менавіта пытанні сацыяльнай палітыкі, інавацыйнай сферы, інфармацыйнай бяспекі, захавання нацыянальнай самабытнасці, гістарычнай памяці і суверэнітэту краіны, забеспячэння сацыяльнай справядлівасці — тыя аспекты, што ў калектывах будаўнікоў абмяркоўваліся на дыялогавых пляцоўках па праекце змяненняў і дапаўненняў Канстытуцыі. Збіраліся на такія сустрэчы і непасрэдна на будаб'ектах. Актыўны ўдзел у абмеркаванні будучыні Асноўнага Закона краіны якраз і праявілі маладыя будаўнікі.

### Выклік работы з дзецьмі

Дзмітрый Мурашка як старшыня галіновага прафсаюза ўпэўнены, што перад будаўнікамі стаіць і важная сацыяльная задача — абудзіць цікавасць у школьнікаў, навучэнцаў, студэнтаў да ўдзелу ў сумесных працоўных акцыях.

— Яны даюць магчымасць падтрымаць нашых маладых людзей, далучыць моладзь да працоўных дэсантаў на карысць грамадства, паказаць, што няма цяжкіх задач, калі працуем разам, — падкрэслівае Дзмітрый Аляксандравіч і расказвае аб цікавым вопыце работы будаўнікоў са студэнтамі.

— Падчас работы на будпляцоўцы на пагранічнай заставе «Усохская Буда» ў Добрушскім раёне супрацоўнікі Будаўнічага трэста № 14 арганізавалі маладзёжны суботнік для студэнтаў. Валанцёры, якія свае сілы ўклалі ў добраўпарадкаванне ваеннага аб'екта, пасля выказаліся, што перагледзелі сваё стаўленне да службы ў арміі.

Згадвае старшыня галіновага прафсаюза і леташні выдатны досвед агульнай работы будаўнікоў са школьнікамі. Вучні школ Гомеля, Добрушскага, Веткаўскага і Гомельскага раёнаў бралі ўдзел у добраўпарадкаванні тэрыторыі вакол мемарыяла «Партызанская крынічка». Практычна кожны дзень 30 юных валанцёраў дапамагалі ў рабоце супрацоўнікам Гомельскага домабудаўнічага камбіната. Змены пачыналі з лекцый аб ваеннай гісторыі. Усяго ў добраўпарадкаванні «Партызанскай крынічкі» ўзяло ўдзел больш за тысячу падлеткаў, у тым ліку тыя, хто знаходзіўся на розных прафілактычных уліках.

— Вось гэта рэальны прыклад патрыятычнага і працоўнага выхавання падлеткаў, да якога мы імкнёмся. Упэўнены, што праз пэўны час гэтыя хлопцы і дзяўчаты прывязуць да мемарыяла сваіх дзяцей і раскажуць, як удзельнічалі ў рэканструкцыі знакавага не толькі для рэгіёна, але і для ўсёй краіны месца, — гаворыць мой суразмоўнік. — А калі моладзь разумее і можа данесці да сваіх аднагодкаў, чаму важна займацца такімі справамі, мы абавязкова захаваем сваю краіну і незалежнасць.

**Гутарыла Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота аўтара і БелТА.**

**ПОЎНЫ ТЭКСТ КАНСТЫТУЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ СА ЗМЯНЕННЯМІ І ДАПАЎНЕННЯМІ, ЯКІЯ ВЫНОСЯЦЦА НА РЭФЕРЭНДУМ, — У НУМАРЫ «ЗВЯЗДЫ» ЗА 22 СТУДЗЕНЯ І НА САЙЦЕ ZVIAZDA.BY**

# Папяровы і пластыкавы

### Кругласутачныя і праактыўныя

Кожны, хто атрымлівае ID-картку, аўтаматычна набывае і крыптаграфічнае прыкладанне — электронны лічбавы подпіс (ЭЛП), прыдатны для выкарыстання дзесяць гадоў. Ён знаходзіцца на гэтым дакуменце і дае чалавеку ўваход у лічбавы свет, заўважыў **Раман ГРАДУСАЎ, дырэктар Нацыянальнага цэнтра электронных паслуг (НЦЭП):**

— Да выдачы ID-картак ЭЛП быў больш запатрабаваны юрыдычнымі асобамі. Цяпер жа пры атрыманні пасведчання асобы грамадзяне атрымліваюць і электронны лічбавы подпіс. Адзінай крыніцай уваходу для атрымання электронных паслуг і адміністрацыйных працэдур цяпер з'яўляецца Адзіны партал электронных паслуг Нацыянальнага цэнтра электронных паслуг. Тут размешчана каля 250 электронных сэрвісаў і адмінпрацэдур. Штодня беларусам аказваецца да 35 тысяч электронных паслуг і 200 адміністрацыйных працэдур. Людзі зразумелі зручнасць узаемадзеяння праз партал, калі для атрымання выпісак, даведак ці дакументаў неабавязкова ісці ў адпаведны орган, а атрымаць усё у анлайн-рэжыме і кругласутачна.

Тым не менш, нягледзячы на зручнасць, пакуль у асобных рэгіёнах новымі дакументамі карыстаецца толькі чвэрць жыхароў. Астатнія атрымліваюць папяровыя пашпарты, падзяліўся **Аляксей БЯГУН, начальнік Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС:**

— Пры гэтым амаль 500 беларусаў маюць два біяметрычныя пашпарты для выезду за мяжу. Гэта своеасаблівае ноу-хау, калі чалавек, які мае ID-картку, можа зрабіць два дакументы для замежных паездак і карыстацца імі адначасова для сведчання сваёй асобы. Гэта новая вяха ў канцэпцыі выдачы дакументаў, якія сведчаць асобу. А таксама сур'ёзная падмога для грамадзян у якасці сродкаў ідэнтыфікацыі ў інтэрнэце.

Спецыялісты працуюць над павелічэннем колькасці паслуг на партале, каб зрабіць атрыманне сэрвісаў для грамадзян зручным, эфектыўным, хуткім і з мінімальнымі камунікацыямі. Яны спадзяюцца, што неўзабаве з'явяцца і праактыўныя паслугі, калі за грамадзяніна будзе думаць дзяржава, падкрэсліў дырэктар НЦЭП:

— Паслугі будуць прывязаныя да какладнай жыццёвай сітуацыі. Напрыклад, пры нараджэнні дзіцяці чалавеку не трэба будзе думаць, калі пайсці ў ЗАГС, каб атрымаць пасведчанне аб нараджэнні, або стаць на чаргу ў дзіцячы садок ці запрэзерваваць месца ў школе. Усё гэта будзе адбывацца ў аўтаматычным рэжыме, і чалавеку проста паведамяць, калі і куды яму падысці, каб атрымаць пэўны сэрвіс.

### Права на нераспаўсюджванне і нескажэнне

ID-картка мае надзейную ахову ад сцірання і механічных пашкоджанняў, а персанальныя даныя (ПД) беларусаў цалкам абароненыя, запэўнілі эксперты.

— Кожны грамадзянін павінен быць упэўнены, што інфармацыя, якую ён дазваляе перадаваць у інфармацыйную сістэму і апрацоўваць, заўжды будзе надзейна абароненая, — абазначыў **Аляксандр ГОРБАЧ, дырэктар Навукова-даследчага інстытута тэхнічнай абароны інфармацыі.** — Сама ID-картка выканана ў адпаведнасці з міжнароднымі патрабаваннямі па абароне даных, якія яна ўтрымлівае. А ўся інфармацыйная сістэма (ад прад'яўлення ID-карткі да атрымання пэўнай даведкі з інфармацыйных сістэм або ўнясення дадатковых звестак) выканана з патрабаваннямі па абароне інфармацыі. Яна мае атэстат адпаведнасці па бяспецы інфармацыі, якая апрацоўваецца ў гэтай сістэме.

Прыйшоўшы ў абаненцкі пункт (пошту, банк ці іншую ўстанову, дзе грамадзянін мусіць прад'явіць дакумент для атрымання пэўнай паслугі), чалавек павінен быць упэўнены, што звесткі, якія ён прадставіць аб сабе, не будуць несанкцыянавана распаўсюджаны ці скажоны, падкрэсліў спецыяліст:

— Сістэма створана такім чынам, што ўся інфармацыя, якая перадаецца, шыфруецца, а камп'ютар, на якім вы працуеце з дапамогай счытвальніка ID-карткі, не захоўваецца на ім, а адразу перадаецца ў інфармацыйную сістэму для апрацоўкі. Для гэтага ў Беларусі была створана Адзіная сістэма ідэнтыфікацыі юрыдычных і фізічных асоб (АС ІЮФА), якая дазваляе апрацоўваць даныя ў абароненым рэжыме.

Магчымасць працаваць з ID-карткамі дагэтуль маюць не ўсе ўстановы, хоць задоўга да з'яўлення новых дакументаў усе дзяржорганы і арганізацыі апавясцілі, што ім неабходна набыць адпаведнае абсталяванне — счытвальнікі і кліенцкі дадатак АС ІЮФА (апошні — бясплатна). Магчымасць наладзіць работу з новымі дакументамі залежыць ад адказнасці людзей, якія працуюць на месцах, пракаментаваў Раман Градусаў:

— «Белпошта», прынамсі, з першага дня пачатку выдачы ID-картак была гатовая да работы з імі. На асобных прадпрыемствах проста не выканалі патрабаванні па закупцы счытвальнікаў у неабходнай колькасці.

Ён дадаў, што пры стварэнні новых айчынных дакументаў спецыялісты карысталіся вопытам замежных краін, а ID-картка мае пэўны патэнцыял для развіцця:

— Акрамя ЭЛП, на чыпе, які зашыты ў ID-картку, ёсць таксама біяметрычныя дадатак у адпаведнасці са стандартамі ІКАО, які ў далейшым (пры заключэнні пэўных міжнародных пагадненняў) дазволіць нашым грамадзянам выкарыстоўваць дакумент у тым ліку і як замежны пашпарт. Праўда, у тых выпадках, калі не патрабуецца адзнака аб візе ці перасячэнні мяжы.

Эксперты ўпэўнены, што паступова дзяржава ідзе да лічбавізацыі, пра што сведчыць статыстыка. Прынамсі, толькі інфармацыйнымі рэсурсамі МУС за студзень сёлета было аказана больш як 115 тысяч паслуг па прадастаўленні персанальных даных з адзінага рэгістра насельніцтва, а таксама прадстаўлена звыш за 60 тысяч даных аб фізічных асобах, у тым ліку аб месцы іх жыхарства. А з 3 студзеня ў прамысловую эксплуатацыю запушчана новая версія адзінага партала электронных паслуг — АПК «Платформа» (platform.gov.by).

Тут ужо рэалізаваны механізм, каб чалавек, які заказвае адмінпрацэдуру, мог падаць заяву і адпаведныя дакументы, аплаціць паслугу і атрымаць вынік. Пры гэтым ён у любы час візуальна на партале можа даведацца, на якім этапе знаходзіцца разгляд яго паслугі.

Ірына СІДАРОК.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Перспектыва

# Будслаў стане цэнтрам рэлігійнага турызму

## Старшыня Мінаблвыканкама і прадстаўнікі Рымска-каталіцкай царквы абмеркавалі аспекты ўзаемнага супрацоўніцтва

**Аднаўленне Будслаўскага касцёла Унебаўзяцця Найсвяцейшай Дзевы Марыі і перазахаванне астанкаў манаха, дамініканца Фабіяна Малішоўскага абмеркавалі на сустрэчы старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН і прадстаўнікі Рымска-каталіцкай царквы.**

— Як прадстаўнік Ватыкана і Папы Рымскага скажу, што я вельмі задаволены сваім знаходжаннем тут, магчымасцю абмеркаваць надзённыя пытанні, перспектывы супрацоўніцтва, — падкрэсліў **Апостальскі нунцый у Рэспубліцы Беларусь Антэ ЁЗІЧ.** — Я думаю, што такія кантакты прынясуць плён. Сёлета мы будзем адзначаць 30-годдзе дыпламатычных адносін паміж Ватыканам і Рэспублікай Беларусь. Упэўнены, перспектывы гэтых адносін — дыялог, мір, згода. Такі наш падыход. І святары, і епіскапы будуць усё для гэтага рабіць.

На перспектывах супрацоўніцтва засяродзіў увагу і **старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН.**

— Наша Беларусь шматканфесіянальная краіна. Тут усе рэлігіі роўныя. На тэрыторыі Мінскай вобласці ёсць знакавыя для ўсёй краіны каталіцкія аб'екты. Гэта перш за ўсё Будслаўскі касцёл. Міншчына яшчэ ў 2012 годзе ўкладвала немалыя сродкі ў рамонт гэтага помніка архітэктуры. Мы сёння абмяркоўвалі не толькі захаванне аб'екта, але і перспектыву развіцця Будслава як магчымага цэнтра рэлігійнага турызму Мінскай вобласці. У хуткім часе дамовіліся пабываць там, для таго каб разумець, у якім напрамку рухацца. На мой погляд, адносіны дзяржавы, у тым ліку і Мінскага аблвыканкама з касцёлам нармальныя, пазітыўныя. Мы можам прынесці адзін аднаму шмат карысці.

У сустрэчы таксама ўзялі ўдзел намеснік міністра замежных спраў Беларусі Сяргей Алейнік, архіепіскап Мінска-Магілёўскай архіепархіі Юзаф Станеўскі, святар, настаяцель рэлігійнай абшчыны «Рымска-каталіцкі прыход Святога Казіміра ў г. Стоўбцы» Ігар Лашук.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Па сутнасці

# РАДАВЫ ПРАКЛЁН



**Беларусі пашанцавала шмат у чым. Пералічваць не буду. Не пра тое размова. Беларусі не пашанцавала з апазіцыяй. Гэта радавы праклён нашага народа. Нават самі сабе «сымбалі» абраць не могуць. Толькі запэцканыя паласой крыві лёкаяў-нацыстаў. Нават з мноства варыянтаў «пагоні» вызначылі сабе толькі тыя, што «ўпрыгожвалі» паперы калабарацыянісцкіх фарміраванняў нацысцкай акупацыі. Кажуць жа: Бог шэльму меціць!**

Ну разумею, калі апазіцыя крытыкуе і прапануе. Гэтае слова родам з латыні: «апазіцыя» ад гэтага ж кораня — «апанент», «апаноўваць» — пярэчыць. Пярэчыць уладзе, але не знішчаць дзяржаву. Звяртаюся да «філёлягаў» рэвалюцыйных прамоў: вучыце матчастку. І кадыфікаваныя нормы беларускай мовы. Дару лайфхак: газету «Звязда» трэба чытаць часцей, чым польскія тэлеграм-каналы. А то мала таго, што літаратурную спадчыну Купалы і Багдановіча запэцкалі паланізмамі, дык яшчэ мову палітызавалі, выкачалі ў гразі, зганцілі сваімі неанацыяналістычнымі заклікамі.

Вырашэннем моўнага пытання некалі застрашваў усіх жыхароў Беларусі цяперашні палітычны мігрант Пазняк. Сапраўдным моўным рэкетам заняўся. Запалохаў усіх, нават этнічных беларусаў. Не кажучы ўжо пра дзяцей і ўнукаў сібіракоў і масквічоў — герояў аперацыі «Баграціён».

Праўда, сваю гістарычную місію Зянон з Варшавы выканаў: так узрушыў народ, што забяспечыў рэкордную яўку на першых выбарах Прэзідэнта. Замест мовы варожасці і гвалту беларусы выбралі мову паразумення і даверу. Выбралі гаспадара зямлі. Размаўляюць, не педаліруючы мяккім знакам, і працуюць, трымаючыся сваёй цвёрдай пазіцыі.

А вось апазіцыя як была, так і засталася радавым праклёнам нашага народа. І зноў прама па лбе на тыя ж граблі наступілі «ТВАРЫ» пратэстаў. Выйшла па сцэнарыі чужых спонсараў і з неверагодным шляхетным пазёрствам — карацей, тэатральна, але непрафесійна. А Мельпамена памылак не даруе. Заходнія мецэнаты не задаволеныя. Звычайна іх сцэнарыі не падводзілі. Пастаўленыя на плошчах у дзясятках краін. А тут канфуз здарыўся. У Мінску абышлося без аншлагу.

На прэм'еру мяцяжу пару дзясяткаў тысяч паклікалі — многія аказаліся мясцовымі разявакамі. Хапала і гастралюючых салдат пераваротаў. А як апрануліся — у белае — паводле дрэс-коду падобных майданутых пастановак. І апладысменты на ажыўленых пятачках Мінска былі, і кветкі з сабой пару разоў прынасілі. Праўда, дарыць тое не было каму. Усе артысты тэатра абсурду разбегліся па замежных грымёрках.

Беларусы на такія прадстаўленні ўжо нагледзеліся. І сябе пад вокнамі і ў суседзяў па тэлевізары. Ды і «акцёры» і «акцёркі» аказаліся не камільфо. Хатняя гаспадыня з Мікашэвічаў, нібы яйкі аб патэльню, разбіла літаратурны пафас Маякоўскага: «Дарожка абрусам! Мы і кухарку кожную навучым кіраваць дзяржавай!».

Дарожка абрусам аказалася не чырвонай дывановай. І не ў Палац Незалежнасці. А як хацелася па чырвонай дывановай — ад крыві ад'ягораных беларусаў, — грацыёзна цокаючы абцасікамі, ды ў дамкі. А выйгралі толькі ў паддаўкі. Прычым хто, як і навошта рухае фігуркі на гэтай вялікай шахматнай дошцы, Бжэзінскі патлумачыў яшчэ чвэрць стагоддзя таму. Вось менш бы бегала Света на спатканні да нахабніка і хулігана Ціханоўскага. А больш бы кніг чытала — не прыйшлося б зараз у паддаўкі гуляць па капрызе сваіх палітычных сутэнёраў. Як вядома, хто жанчыну танцуе... Наогул, прыходзіцца гастралявацьі тэксты з чужой галавы чытаць. Гэта як сукенкі з чужога пляча. Галізна прыкрытая, але відаць: не тваё. Палітыка. Інвестыцыі трэба адпрацоўваць. Гэта толькі апошні дыктатар Еўропы грошы на білет бясплатна можа даць. А свет капіталізму — ІНШЫ.

Вось, напрыклад, для Пашы шлях у дэмакратыю быў менш камфортны. І страціў больш, і дабіраўся няёмка. Гаворць, у багажніку аўтамабіля. Нездарма дырэктарам тэатра папрацаваў. Не толькі пад сябе рамонт зрабіў. Але, відаць, сцэнарый пастаноўкі «Вітаўта» пачытаў. Толькі гістарычны персанаж пад маскай жанчыны ў родны Полацк уцёк. А дыпламат, міністр і НЕэфектыўны менеджар тэатра — усё з пратэрмінаваным тэрмінам прыдатнасці, затое са гістарычнай «фанабэрыстай» прыдатнасцю — схаваўся пад спадніцай гістарычных апанентаў — беларускай нацыянальнай ідэі. Эх, шкада, Пал Палыч так і не зразумеў ні сэнсу «Тутэйшых», ні ўсёй творчасці вялікага Беларуса, тэатр імя якога і разбураў. Занадта еўрапезаваўся. Да ступені калабарантаў-кушаляў. А есці ж хочацца. І пажадана не насухую. А калі прайграў усухую, пачуваешся як «збядненлы шляхцюк», які на варшаўскіх фуршэтах капітал прадаў. А тут ёсць шанц — апошні шанц — падоўжыць ніштаватае існаванне. На апахмелку новы транш — 30 срэбранікаў — пад Рэферэндум вылучыў калектыўны Захад. Наступным разам дармовых іудавых грошай можна і не дачакацца...

Сапраўды апазіцыя — гэта радавы праклён нашага народа. Ну як можна шчаміцца ў палітыку з вось такой дрэннай памяццю, бо самі ж крычалі, заклікалі, спявалі, тупалі нагамі — «пЭрамЭн». А калі іх прапануюць ажыццявіць самым спакойным і дэмакратычным шляхам — пачынаюць ёрнічаць і гарэзнічаць: ірвіце, псуйце бюлетэні...

Так, апазіцыя — гэта радавы праклён нашага народа. Калісьці Пазняк цягнуў за сабой паўсляпую і паўгалодную эліту ў Курапаты. Гэта так яны «церабілі шлях да Беларусі». І калі раней шлях да «эўрапейскай дэмакратыі» праходзіў праз «могілкі», то цяпер, калі слухаць неакалабарацыяністаў, — гэта ўжо прамы шлях на могілкі нашай дзяржаўнасці — да «раскіданага гнязда».

Праўда, ёсць і іншы шлях. На выбарчы ўчастак. Таму нават самым неверагодным час цверазець ад заморскага амбрэ і сапраўды прыслухацца да тых, якіх патрабуе сэрца нашай Беларусі.

Яўген ПУСТАВОЙ.

# ВЫ І ЁСЦЬ СВЯТЛО!

*У маршрутцы, на якой я звычайна дабіраюся са сваёй вёскі да Мінска, цудоўны кіроўца. Калі бачыць, што хтосьці спазняецца, абавязкова пачакае. Аднойчы нават вярнуўся назад, каб забраць жанчыну, якая ў роспачы яму патэлефанавала. А яшчэ ён усіх сумных пасажырак называе «зайкамі». Пасля гэтых слоў заклапочаныя твары жанчын імгненна асвятляе ўсмешка. Ды і ўсе астатнія, хто знаходзіцца ў салоне, атрымліваюць пазітыўны зарад на новы дзень.*

*На выхадных пераглядзела фільм «Заплаці іншаму». Там школьны настаўнік дае сваім вучням нетыповае заданне: прыдумаць, як можна змяніць свет да лепшага. Тым самым натхняе сямікласніка Трэвара запусціць ланцужок дабра: «Я дапамагаю табе, а ты, у сваю чаргу, дапамажы камусьці іншаму». Пасля прагляду гэтага фільма і мне захацелася абавязкова зрабіць штосьці для таго, каб свет стаў крышачку лепшым. Таму неадкладна ўзяла чысты аркуш і склала спіс добрых спраў на найбліжэйшы месяц. Пра тое, як я рабіла гэты свет лепшым, магчыма, распавяду пазней. А пакуль — некалькі светлых гісторый з жыцця маіх добрых сяброў.*

*Алесь і яго сямігадовая дачушка Васіліса жывуць у Рагачове. З вокнаў іх кухні відаць кантэйнеры, у якія жыхары суседніх дамоў выносяць смецце. Таму Алесю часта даводзіцца назіраць, як бамжы «сартуюць» там адходы. Адным снежаньскім марозным вечарам увагу майго сябра прыцягнуў мужчына на мыліцах. Спачатку ён правёў рэвізію чорных пакетаў, што стаялі побач з бакамі. А затым тут жа, не адыходзячы, пачаў выкладваць на абшарпаны стол, які таксама, відаць, хтосьці выкінуў, знойдзеныя аб'едкі. Алесь хуценька склаў у кантэйнер прыгатаваную на вячэру печань, паклаў у пакунак хлеб і выбег на вуліцу. Са словамі «Вырашыў вас пачаставаць, а то шмат нагатаваў» — працягнуў мужчыну пакет. Той расплыўся бяззубай усмешкай і тройчы падзякаваў. Калі ж Алесь зноў апынуўся каля свайго акна, вельмі здзівіўся ўбачанаму. Мужчына беражліва і па-гаспадарску зграбаў рукой крошкі са стала, а пусты кантэйнер і пакецік выкінуў у бак для смецця.*

*Дачка Алеся цэлы год адкладвала манеты, што атрымлівала ад зубной феі ды ад бацькоў за добрыя паводзіны. Беражліва апускала іх у скарбонку і марыла пра той дзень, калі сама назбірае на разумны гадзіннік. І вось неяк увечары Алесь, вярнуўшыся з работы, распавёў Васілісе пра абсалютна незнаёмага ёй хлопчыка. Пра тое, што Ільюша захварэў, і сям'я збірае грошы на яго лячэнне ў Іспаніі. І што на прадпрыемстве, дзе ён працуе, усе ахвяравалі, хто колькі можа. Васіліса нічога не сказала, але цэлы вечар хадзіла і пра нешта думала. Перад сном, пасля таго як тата прачытаў ёй казку, яна паведаміла: «Ведаеш, я вырашыла аддаць усе свае манеткі на лячэнне таго хлопчыка». На наступны дзень яны высыпалі са скарбонкі ўсе Васілісіны зберажэнні і разам панеслі іх у банк. «Дачушка, табе дакладна не шкада, бо грошы назад не вернуць?» — на ўсякі выпадак удакладніў Алесь перад касай. «Тата, гэта ж проста грошы. На гадзіннік мы яшчэ назбіраем, а хлопчык можа выздаравець».*

*Асабіста ўва мне вельмі адгукаецца гісторыя амерыканскай пісьменніцы Элізабет Гілберт пра тое, як яна трапіла ў затор. Аўтобус, у якім ехала жанчына, быў набіты стомленымі і раздражнёнымі пасажырамі. На вуліцы як з вядра ліў дождж. На Сёмай Авеню кіроўца зрабіў аб'яву: «Сябры! Я не магу нічога зрабіць з надвор'ем і пробкамі. Але сёе-тое ў маіх сілах. Прапаную кожнаму выходзіць праз пярэднія дзверы. Я працягну руку. Як пройдзеце міма, пакладзіце ў яе свае клопаты і раздражненне. Я паеду далей праз раку Гудзон і скіну ўсё гэта дабро проста ў ваду.» Пасажыры засмяяліся. На прыпынку кіроўца сапраўды прасунуў руку ў акенца для білетаў. Некалькі пасажыраў выйшлі праз пярэднія дзверы і зрабілі выгляд, нібы паклалі яму штосьці ў далонь. І так было на кожным прыпынку аж да самай ракі.*

*«Часам на ўсіх нас апускаецца цемра. Вы страчваеце грошы, сяброў, веру, любоў... Ад навін, якія адбываюцца ў свеце, халадзее ўсё ўнутры. Вам патрэбнае святло, а вы не можаце знайсці яго. Але калі што — вы і ёсць святло... Калі мне дрэнна, я згадваю таго кіроўцу аўтобуса і пытаюся ў сябе: а што я магу зрабіць вось цяпер, каб стаць святлом?, — кажа Элізабет Гілберт. — Вядома, я не магу спыніць глабальнае пацяпленне, войны, перарабіць людзей. Але я магу паўплываць на тых, каго сустракаю, нават калі мы незнаёмыя. Смутак і страхі заразныя, але таксама заразныя любоў, цярпенне і шчодрасць. Больш за тое, я думаю, што гэта адзіны спосаб асвятлення свету: адзін прыпынак за другім, аж да самай ракі».*

*Кім бы мы з вамі не былі, як бы ні загразлі ў штодзённых справах, я таксама веру, што кожны з нас можа стаць крыніцай святла. І для гэтага не трэба быць вядомым чалавекам ці мільянерам. Бо святло — яно ж у простых рэчах. Такіх, як добрае слова, кавалак хлеба ці манеткі ад зубной феі, якія даюць надзею, што ўсё будзе добра. Больш за тое, працягваючы руку іншым, мы дапамагаем у тым ліку і сабе. Як пісаў мой улюбёны Уладзімір Караткевіч: «Але вечна тваім застанецца толькі тое, што ты аддаў».*

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**


Сямейная газета

Выпуск № 3 (185)


Тыя, хто побач

**Валерый КАНЯХІН:**

# «ЛІЧУ ЗА ЛЕПШАЕ ХАВАЦЬ СВАЁ ШЧАСЦЕ АД ЧУЖЫХ ВАЧЭЙ»



Спявак Валерый КАНЯХІН з жонкай Наталляй і дачушкай Аліначкай.

**Ён увесь час у думках пра творчасць, пра новыя песні і канцэрты, аднак усё ж лічыць, што галоўнае ў жыцці — сям'я.**

— Нарадзіўся я ў маленькай сям'і — адна мама, бацьку ніколі не бачыў. А заўсёды хацелася жыць у вялікай. Мама мяне нарадзіла даволі позна, у 40 гадоў. Жылі мы тады ў раёне Вяснянка, што ў Мінску, хадзіў у музычную школу № 10 імя Глебава, вучыўся па класе фартэпіяна — скрыпка. Творчасць у маім жыцці дзякуючы блакітнай крыві. Мая бабуля Цымерман, немка, якая ў свой час пайшла замуж за Каняхіна, выйшла з раскулачаных казакоў. У майго прадзеда Каняхіна Фёдара Васільевіча было 13 дзяцей, ён удзельнік Руска-Японскай, Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, мае шэраг медалёў. У майго таты, прозвішча Пятровіч, маці была цыганкай, бацька — беларусам. Вось і атрымліваецца: кроў — нямецкая, беларуская, казацкая, цыганская.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

Кашалёк

# ШЧАСЦЕ — НЕ Ў ГРОШАХ, ВА ЎМЕННІ ТРАЦІЦЬ ІХ РАЦЫЯНАЛЬНА

## Як навучыць гэтаму дзіця?

**Дзіцяці абавязкова трэба ведаць, што такое грошы і навошта яны патрэбны. Адкуль бяруцца ў сям'і? На што бацькі іх трацяць? Як збіраюць? І навошта? Дзіця можна і трэба вучыць карыстацца фінансамі рацыянальна. І для таго, каб гэта зрабіць, неабходна выдаваць яму кішэнныя грошы, бо навучыцца правільна распараджацца сродкамі, не маючы ўласных, проста немагчыма.**

Многія бацькі лічаць, што гэта бессэнсоўнае выкарыстанне іх бюджэту, бо дзіця выдаткуе грошы толькі на забаўкі, пры гэтым яшчэ стане капрызным і распешчаным. «Не зарабляе — не ведае, як дастаюцца грошы, значыць, не будзе цаніць іх». А дарма. Такія думкі ўзнікаюць толькі тады, калі ў бацькоў няма дакладнага ўяўлення, як навучыць малое правільна абыходзіцца з грашыма. А гэтыя веды проста неабходныя, бо каб быць паспяховымі ў жыцці, не менш важна ўжо з ранніх гадоў разумець, якую карысць могуць прынесці веды ў галіне фінансаў.



Калі ж трэба пачынаць навучаць дзіця адказнаму стаўленню да грошай?

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*

Сямейная медыяцыя

# ПАДЗЯЛІЦЬ ДЗЯЦЕЙ, МАЁМАСЦЬ, КРЫЎДЫ

## Праз медыяцыйнае ці міравое пагадненне, давер і дамоўленасці



**Мірна скасаваць шлюб, падзяліць маёмасць, дамовіцца аб зносінах з дзецьмі і вырашыць іншыя сямейныя канфлікты без лішніх нерваў і грошай магчыма. З дапамогай медыятара ў Беларусі сотні спраў завяршаюцца прымальна для абодвух бакоў, а 90 % медыяцыйных пагадненняў добраахвотна выконваюцца ўдзельнікамі спрэчкі. Больш за тое, ужо пару гадоў суды накіроўваюць сужэнцаў у медыяцыю па пытаннях, якія датычацца разводу, аліментаў, падзелу маёмасці. Закон аб медыяцыі ў Беларусі прыняты не так даўно, у 2013 годзе, і працягвае ўдасканальвацца, але станоўчых вынікаў ад работы медыятара ўжо мноства. Актыўна развіваецца медыяцыя сёння і ў Расіі, Казахстане, Украіне і Малдове. Чым карысны механізм сямейнай медыяцыі і чаму ён лепшы за суд, расказала Рыта БОМЕРТ, практыкуючы адвакат Мінскай гарадской калегіі адвакатаў, медыятар.**

### АЛІМЕНТЫ НА АДЗЕННЕ, АДПАЧЫНАК, ЛЯЧЭННЕ

Медыяцыя дазваляе бакам дамовіцца добраахвотна, з мінімальнымі фінансавымі затратамі і на тых умовах, якія не заўжды магчыма прапісаць у міравым пагадненні, бо гэты дакумент абавязкова базіруецца на прававых нормах, падкрэсліла спецыяліст:

**«Вельмі важна ў працэсе медыяцыі выгаварыцца, каб сышлі эмоцыі і бакі змаглі чуць адзін аднаго і думаць рацыянальна, каб вярнуць давер да сваёй былой паловы. Толькі пасля гэтага можна чакаць, што атрымаецца канструктыўны дыялог».**

*— Пытанні ўтрымання дзяцей і прызначэння аліментаў на іх пэўным чынам прапісаны ў законе, а вось моманты, што датычацца зносін з дзецьмі, якія заўжды вельмі эмацыянальныя, — не вельмі. Пры гэтым, як паказвае практыка, якое рашэнне вынесе суд першай інстанцыі, такім яно, з вялікай верагоднасцю, і замацуецца пасля ў апеляцыйнай і касацыйнай інстанцыях. Медыяцыя ў такіх спрэчках вельмі эфектыўная, бо спрачальнікі прыходзяць у яе добраахвотна, а медыятар — незалежны трэці бок, які роўнааддалены ад абодвух спрачальнікаў. Да таго ж умовы будучага пагаднення выпрацоўваюцца самімі ўдзельнікамі. У выніку складаецца медыяцыйнае пагадненне.*

У снежні 2019 года былі ўнесены змяненні, звязаныя з яго заключэннем, і суды з таго часу накіроўваюць спрачальнікаў у медыяцыю ў справах разводу, па аліментах, падзелу маёмасці. Медыяцыйнае пагадненне не мае юрыдычнай сілы — яно для добраахвотнага выканання. Але калі яго прадставіць суду і зацвердзіць шляхам заключэння міравога пагаднення, то ўжо гэты дакумент можна будзе выканаць у прымусовым парадку, калі нейкі з бакоў стане несумленна выкарыстоўваць свае правы. Аднак гэта здараецца, як сведчыць статыстыка, толькі ў 10—15 % выпадкаў, у той час як па прымусовае выкананне судовых рашэнняў звяртаюцца 60—80 % спрачальнікаў. Дамаўляцца ў медыяцыю, дарэчы, можна прыйсці і тады, калі ўжо цягнецца судовы разбор.

Згодна з законам, на аднаго малога выплачваюцца аліменты ў памеры 25 % ад заробку, на дваіх — 33 % і 50 % — на траіх і больш. А ў медыяцыі можна выкарыстаць іншыя ўмовы. Напрыклад, вызначыць грашовае ўтрыманне ў пэўнай колькасці базавых велічынь, альбо аплату адзення і абутку, гурткоў ці адпачынку або лячэння малога — на гэта бакі больш пагаджаюцца, бо адразу зразумела, на што будуць расходавацца грошы, удакладніла адвакат.

Медыяцыя карысная і ў выпадках, калі пара высвятляе парадак зносін з малымі, а таксама пры падзеле маёмасці паміж сужэнцамі. Судовая працэдура досыць дарагая, таму што судовая пошліна складае каля 5 % ад ацэначнага кошту маёмасці. Медыяцыя дазваляе пазбегнуць такіх судовых расходаў і заключыць пагадненне на ўмовах, якія задавальняюць абодва бакі.

*— Як паказвае практыка, спрэчкі, звязаныя з дзецьмі, суд ніколі не вырашыць так, каб былі задаволеныя абодва бакі, калі ў іх кардынальна розныя погляды на выхаванне і ўтрыманне. Медыяцыя ж глыбей разбірае жаданні спрачальнікаў. Пры гэтым можна вызначыць адзін парадак зносін бацькоў з малымі да трох гадоў, а калі дзіця стане школьнікам — іншы. Такія дамоўленасці выконваюць значна больш ахвотна, і нават для самога дзіцяці гэта больш эфектыўна. Згодна з судовай практыкай, пражыванне некалькіх дзяцей прызначаюць толькі з адным з бацькоў. А падчас медыяцыі можна ўказаць, што малыя жывуць асобна з кожным з бацькоў, аднак яны паміж сабой амаль штодня бачацца і прыходзяць адзін да аднаго, і ў выніку іх зносіны не перарываюцца.*



### БАЦЬКІ, БАБУЛІ, СУСЕДЗІ...

Хоць медыяцыя забяспечвае поўную канфідэнцыяльнасць пытанняў, якія абмяркоўваюцца падчас яе, і гэта зусім не публічная працэдура ў параўнанні з судовым пасяджэннем, многія па-ранейшаму ставяцца з недаверам да новага інстытута, а некаторыя нават не пагаджаюцца на сустрэчу з медыятарам. Асабліва прыкра, калі адзін бок гатовы мірыцца такім чынам, а другі — аніяк. Тады ўжо задача медыятара — заахвоціць другога спрачальніка да ўдзелу ў працэдуры, растлумачыўшы, што гэта дапаможа захаваць адносіны з дзецьмі ці грошы, калі справа датычыцца разводу. Найчасцей удаецца ўгаварыць чалавека, але калі ён катэгарычна адмаўляецца ад медыяцыі, то нічога не зробіш, бо гэта добраахвотная сустрэча, нагадала Рыта Бомерт:

*— Спачатку (яшчэ да прыняцця закона аб медыяцыі) яна была бясплатная, каб людзі маглі ўпэўніцца ў тым, што гэта эфектыўны спосаб вырашэння спрэчак. Кожная сустрэча цягнецца ў сярэднім тры гадзіны (больш часу запар дамаўляцца — цяжка, бо бакі стамляюцца). А каб знайсці рашэнне, якое падыходзіць усім, трэба ад дзвюх да шасці сустрэч. Прычым гэта заўжды вельмі энергазатратны працэс і для спрачальнікаў, і для медыятара. Кошт мерапрыемства вызначае сам спецыяліст, і гэта можа быць ад трох да дзесяці базавых велічынь, што ў любым выпадку танней, чым судовая цяжба.*

Медыяцыю можа прымяняць у самых розных спрэчках паміж бацькамі, суседзямі, школьнікамі, сцвярджае спецыяліст:

*— Аднойчы да мяне прыйшлі суседзі, якія некалькі гадоў судзіліся па зямельным пытанні, а на медыяцыі высветлілася: больш маладому з іх дастаткова было проста папрасіць прабачэння ў больш сталага суседа за тое, што ён калісьці не ў тым месцы пасадзіў елкі.*

Пра сваё жаданне мець зносіны з унукамі пасля разводу сужэнцаў могуць заяўляць таксама бабулі і дзядулі, і гэтае пытанне больш эфектыўна вырашае тая ж медыяцыя. Аднак, згодна з законам, спачатку вызначаецца парадак стасункаў дзяцей з бацькам, і ўжо пасля — з бабулямі і дзядулямі. Хоць можна і аб'яднаць абодва грамадзянскія працэсы, калі судом вызначаецца парадак зносін адразу ўсіх удзельнікаў і выносіцца адно рашэнне, удакладніла адвакат.

Вельмі важна ў працэсе медыяцыі выгаварыцца, каб сышлі эмоцыі і бакі змаглі чуць адно аднаго і думаць рацыянальна, каб вярнуць давер да сваёй былой паловы. Толькі пасля гэтага можна чакаць, што атрымаецца канструктыўны дыялог, падкрэсліла спецыяліст:

*— Аднойчы жанчына вельмі не давярала бацьку дзіцяці, бо ён быў іншаземец. Яна заняла пазіцыю «ён усё роўна мяне падмане». Я прапанавала бацьку заплаціць аліменты на паўгода наперад, каб пацвердзіць свой намер. У выніку маці супакоілася, і бакі змаглі дамовіцца.*

У Беларусі прайшло навучанне і атрымала пасведчанні медыятара ўжо больш як 1000 чалавек па ўсёй краіне. Спіс айчынных медыятараў ёсць у рэестры на сайце Міністэрства юстыцыі. Спецыялісты займаюцца працоўнымі, камерцыйнымі і сямейнымі канфліктамі. Выбраць патрэбнага, пэўна, цяжка, але ж усе яны валодаюць патрэбнымі ведамі для працэдуры медыяцыі, падкрэсліла адвакат. У краіне ёсць некалькі цэнтраў па перагаворах і медыяцыі, куды таксама можна звярнуцца са сваёй праблемай і дзе жадаючым дамовіцца праз медыяцыю парэкамендуюць спецыяліста. Тыя, хто спецыялізуецца менавіта на сямейных спрэчках, аб'яднаныя ў арганізацыі «Ліга сямейных медыятараў».

Ці далучаць дзяцей да ўдзелу ў медыяцыі, пытанне спрэчнае, бо з малымі павінны ўсё ж працаваць прафесійныя псіхолагі. Аднак праводзіць дыягностыку, каб паказаць бацькам, напрыклад, што дзіця любіць іх аднолькава, — добрая справа. Запрашаць на медыяцыю нейкі дадатковы трэці бок таксама можна, але ж гэта не азначае паляпшэння сітуацыі. Хутчэй, наадварот, яе ўскладненне. Здаралася, што на медыяцыю бакі прыходзілі з адвакатамі, якія найчасцей наадварот не давалі спрачальнікам дамовіцца, хоць тыя і хацелі ўжо гэта зрабіць. У любым выпадку, бацькі, як бы ні спрачаліся, як правіла, сыходзяцца на адным — у любові да сваіх дзяцей.

**«Медыяцыя дазваляе бакам дамовіцца добраахвотна, з мінімальнымі фінансавымі затратамі і на тых умовах, якія не заўжды магчыма прапісаць у міравым пагадненні, бо гэты дакумент абавязкова базіруецца на прававых нормах».**

**Ірына СІДАРОК.**

**Падчас медыяцыйнай сустрэчы не вядзецца ніякіх відэа- і гуказапісаў (нешта памячаць на паперы ад рукі — калі ласка), каб бакі былі ўпэўненыя ў захаванні канфідэнцыяльнасці таго, што адбываецца.**

**Калі медыятар бачыць, што бакі прыйшлі не дамаўляцца, а проста высветліць адносіны, то ён, як, дарэчы, і абодва спрачальнікі, мае права адмовіцца ад працэдуры, бо ў яе няма перспектывы.**

**Добра, калі ў сямейнай медыяцыі ўдзельнічаюць два спецыялісты: медыятар-мужчына і медыятар-жанчына. Так вытрымліваецца гендарны баланс, і гэта пэўным чынам супакойвае бакі.**

**Медыяцыя ўскладняецца, калі адзін з бакоў — іншаземец, бо іграюць ролю розныя менталітэты, іншае стаўленне да дзяцей, уяўленне аб памеры аліментаў, падыход да выхавання і нават моўны бар'ер.**

# «ЛІЧУ ЗА ЛЕПШАЕ ХАВАЦЬ СВАЁ ШЧАСЦЕ АД ЧУЖЫХ ВАЧЭЙ»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)***

— Жыццё дастаткова складанае было з дзяцінства. Памятаю, падпрацоўваў і на рынку, і на пераборцы, грузіў летам гарбузы і дыні. Працы не баяўся, цяпер таксама не баюся. На сёння ў мяне ёсць сям'я, і калі не хапае грошай, магу ўзяць любую падпрацоўку. Маю спецыяльнасць «Муляр-штукатур» — выручала мяне ў часы пандэміі.

Праца ўпрыгожвае чалавека. Бываюць такія перыяды, калі яе няма, тады пачынае балець усё цела, знікае настрой. А калі працую і стамляюся (бо іншы раз вельмі цяжка) — светлы розум. Працуючы, думаю пра творчасць, пра новыя песні. Калі ўжо заключаны дагавор з Домам культуры і вядома дата канцэрта, я ўяўляю, у якім касцюме буду спяваць пэўную песню. У мяне ж шыкоўны мадэльер, дызайнер Святлана Несцяровіч.

## «ДАЧКА — МАЛЕНЬКІ ДЫЯМЕНЦІК»

— Са сваёй сям'ёй, на жаль, праводжу не так шмат часу, як хацелася б. Таму сустракаць тату з работы — заўсёды свята. Аднагадовая дачушка Аліначка, калі я прыходжу, паўзе да мяне і крычыць «тата», абдыме і не адпускае. Усмешка з яе вуснаў не сыходзіць. А ноччу, калі заплача, пакуль жонка Наталля пойдзе грэць малако, малая засынае ў мяне на руках — ёй і сумесь гэтая не патрэбна *(смяецца)*. Дачка — маленькі дыяменцік, смарагд, у якім бачу сябе, яна падобная на мяне. У дзяцінстве гэта ўвогуле адзін твар. Сто працэнтаў, што Аліначка схільная да музыкі. Гэта вельмі адчувальна, цацак музычных ёй падарылі вялікую колькасць: і сінтэзатар, і музычныя мікрафоны, і з меладычнымі кнопкамі. Аліна маленькая, але ў яе ўжо ёсць сістэма, напрыклад, паўгадзіны будзе гуляць толькі з музычнымі цацкамі, потым звернецца да іншых — кожная для яе цікавая. Я часам бяру ў рукі гітару і спяваю ёй песні.

Але не пажадаў бы дачцэ жыцця артысткі. Хоць, лічу, музычную школу яна павінна скончыць: усялякае ў жыцці бывае. Я ў свой час скончыў, але калі б мне раней сказалі, што я буду перамагаць на песенных і паэтычных міжнародных, рэспубліканскіх фестывалях са сваімі творамі, буду праводзіць уласныя канцэрты з аншлагам, заказваць, шыць касцюмы, выпускаць дыскі і спяваць з такімі артыстамі, як Надзея Мікуліч, ніколі не паверыў бы...

## 11 ГАДОЎ РАЗАМ

— Жонка мая, Наталля, нешматслоўная, аднак вельмі за мяне перажывае. Яна зусім не творчы чалавек, прадавец па прафесіі. Любіць мае песні, ходзіць на канцэрты, мае ў тэлефоне папку з маімі трэкамі. Уключае іх, калі займаецца хатнімі справамі. Цяпер яна ў дэкрэтным адпачынку. Да маёй творчасці Наташа ставіцца спакойна. Мы ўжо 11 гадоў разам, я незаўважна перашоў з рэстараннага выканання да работы ў ансамблі самадзейнасці, што пасля перарасло ў прафесійнае рэчышча. Калі б яна была артысткай, па-іншаму рэагавала б, але я дзякую Богу, што мая жонка не артыстка. Я не ўжыўся б з творцам, думаю, пастаянна прысутнічала б саперніцтва. Не ведаю, можа, гэта ад таго, што я крыху эгаіст *(смяецца)*.



Сям'я КАНЯХІНЫХ любіць бавіць час разам.

## ГІСТОРЫЯ ЗНАЁМСТВА

— Гісторыя нашага знаёмства была вельмі цікавая. У свой час я вёў вяселлі, юбілеі. Праводзіў 50-годдзе ў мамы Наташы, і, відома, дачка была на свяце. Тады мы і пазнаёміліся. У мяне заўсёды ўсе знаёмствы пераходзяць у сяброўства. Усе мае юбіляры, каму я вёў святы, па сёння сябруюць са мной. Яе маці, Алена Адамаўна, жыве ў Вяснянцы, працуе ў дзіцячым садку. Аднойчы яна зламала руку. Я прыходзіў да яе, дапамагаў дома. І неяк прыехала Наташа... З той пары мы разам. Але распісаліся толькі цяпер. Вяселле ў нас было закрытае, сабраліся толькі блізкія людзі. Калі на вяселлі збіраецца шмат людзей, нехта можа пазайздросціць, сурочыць. Лічу за лепшае хаваць сваё шчасце ад чужых вачэй.

## КВАТЭРНАЕ ПЫТАННЕ

— У наш час вельмі шмат пар, якія маглі б быць разам. Я ж бачу, што разыходзяцца часта не з-за характару, як прынята лічыць, а з-за таго, што няма дзе жыць. Гэта глабальная праблема. Раней, здаецца, было лягчэй: табе давалі інтэрнат, а пасля не паспееш азірнуцца — у цябе кватэра, прычым ад дзяржавы. А калі ёсць дзеці, то дзвюх- ці трохпакаёвая, калі трэба. Жыццё было іншае, і ў гэтым плане было лягчэй.

А ў цяперашніх рэаліях колькі патрэбна маладым, каб зняць жыллё, няхай нават аднапакаёвую кватэру? Вось у нас і «не склейвалася» з-за кватэрнага пытання. Я з мамай у аднапакаёвай і яна з мамай — у аднапакаёвай. Наташа ездзіла ў Польшчу на заробкі, я тут на падпрацоўках. Грошы збіралі, потым купілі двухпакаёвую кватэру ў пяціпавярхоўку. Таму, пакуль не вырашылася кватэрнае пытанне, не вырашалася і наша жыццё. Потым нарадзілася дзіця. Бачыце, што робяць свае сцены! *(Смяецца.)*

## ДЗЕЦІ

— У Аліначкі ёсць два старэйшыя брацікі — Уладзік і Ваня. Уладзіку 17 гадоў, ён прафесійна займаецца футболам, а Ванечку 12, захапляецца камп'ютарам. Яны розныя, але вельмі добрыя хлопцы. Я рады, што мая дачка расце з братамі. Яна прачынаецца і ідзе да іх, вельмі любіць сваіх братоў. Столькі дзяцей — гэта добра, бо ратуе ад эгаізму. Увогуле, каб дзеці цябе як бацьку паважалі, неабходна ствараць пэўныя межы і паказваць ім добры прыклад. У нашай сям'і ёсць такі прыклад, гэта наш талісман — мая бабуля Галіна Мікалаеўна. Яна заўсёды з намі: і на сямейных святах, і на маіх канцэртах. Бабуля 48 гадоў адпрацавала ліцейшчыцай пластмасы на заводзе «Атлант».

## УСЁ РОБІМ РАЗАМ

— Мы ўсё робім разам. Мая жонка добра гатуе. Я магу ўсё прынесці з крамы, аднак часта ходзім разам, бо Наташа ведае, што купіць. Я гатую таксама смачна, але ў сувязі з маёй загружанасцю паспяваю толькі смачна паесці *(смяецца)*. Калі нейкае свята, станаўлюся каля пліты. Фаршырую карпа — Наташа гэтага не ўмее. Суп я не звару, але зраблю печыва, катлеты, запяканку, усё, што трэба фаршыраваць, начыняць. У мяне ёсць сшытак: у госці прыду — прашу рэцэпт. Раблю каньяк, лікёры, настойкі са слівы, пірамідыў, там дзевяць-дзесяць відаў ягад змяшчаецца. Люблю рабіць закруткі. На маіх закрутках агуркоў на слоічку — заўсёды фірменная этыкетка. Напісана: «Агуркі ў таматнай пасце ад сям'і Каняхіных» і наша сямейнае фота. Я заказваю ў друкарні этыкеткі на кожны слоік. Захапляюся дэкупажам, раблю яго на бутэльках, чамаданах. На клумбе ў нас каля дома розныя дэкарацыі, каструлі ў мяне ўсміхаюцца. Усе, хто сапсаваў дома каструлі, нясуць мне. Малюю на іх усмешку, вочкі, носік. Стаўлю на пень, саджаю кветкі. Наш пад'езд нават прызналі найлепшым у Цэнтральным раёне сталіцы. Я рабію экібаны на заказ — на кожны сезон. Зімовыя экібаны люблю больш за ўсё: бярэш галінкі, высушваеш іх без лісця, афарбоўваеш белым акрылам, пакрываеш бліскучкамі. Пасля бярэш тканіну, робіш з яе стужачкі і на гэтыя галіначкі прывязваеш — прыгажосць!

## ТРАДЫЦЫІ

— Вядома, падарункі пад навагодняй ёлачкай рыхтуем разам. Для мяне важна, каб усе адкрылі, паглядзелі адразу. Вядома, набываюцца яны ў залежнасці ад таго, каму што патрэбна. Я люблю дарыць золата, жонцы абавязкова дару які-небудзь ювелірны выраб. Але сёлета быў мабільны тэлефон *(смяецца)*. Дзецям можам і грошы падарыць, бо яны ўвесь час на што-небудзь збіраюць. Яны мяне могуць павіншаваць з днём нараджэння, прычым, не словамі. Уладзік купіў аднойчы станок для галення. Я быў узрушаны, думаю, дзіця ўжо дарослае. Калісьці я іх на ручках насіў, а цяпер яны мне падарункі купляюць *(смяецца)*. Дзеці могуць дапамагчы з распаўсюджваннем білетаў, прадажам якіх займаюся самастойна. Па ўсім горадзе вісяць афішы, дзе заўсёды напісаны мой нумар для магчымасці дастаўкі білетаў. Напрыклад, неабходна камусьці пяць штук — я саджуся на транспарт і вязу іх. Асабіста ўручаю, людзі ў шоку *(усміхаецца)*. Раней я рабіў гэта адзін, а цяпер у мяне плюс два чалавекі. Ваня — у адзін пункт Мінска, Уладзік — у другі, я — у трэці. Яны дапамагаюць без пытанняў. Гэта дарагога варта.

**Надзея ЗУЕВА.**

**Фота з сямейнага архіва героя.**



Брацікі з маленькай сястрычкай на прагулцы.

# ТАІНСТВА ХРЫШЧЭННЯ

## Што трэба ведаць бацькам?

**Хрышчэнне дзіцяці — мабыць, не менш значная падзея ў яго жыцці і ў жыцці яго бацькоў, чым нараджэнне. Наўрад ці сёння трэба агітаваць кагосьці хрысціць свайго маленькага сына або дачку. Але далёка не ўсе бацькі маюць правільнае ўяўленне аб гэтым таінстве. Пра тое, як падрыхтавацца да хрышчэння і што важна ведаць бацькам, мы запыталіся ў настаяцеля прыхода храма Свяціцеля Спірыдона Трымі-фунцкага, святара Аляксандра ПАЛЬЧЭЎСКАГА.**



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

***— Айцец Аляксандр, у чым сэнс хрышчэння дзіцяці (або дарослага) з пункту гледжання праваслаўя?***

— Таінства Хрышчэння ўстанавіў Гасподзь. Ён сказаў апосталам: ідзіце і прапаведуйце Евангелле, і рабіце хрышчэнне ў імя Айца, і Сына, і Святога Духа. Такім чынам, хрышчэнне — гэта запаведзь Госпада. І гэтае таінства здзяйсняецца да нашых дзён. Яно з'яўляецца бачным знакам, духоўным знакам уваходжання чалавека ў Царкву (Царкву тут варта разумець як духоўны арганізм, і часткай Царквы можна стаць праз гэтае таінства). Іншымі словамі, хрышчэнне — гэта свайго роду дзверы, увайшоўшы ў якія, чалавек трапляе ў Храм (у духоўным сэнсе гэтага слова). Ёсць вучэнне Царквы, што ў Таінстве Хрышчэння ачышчаюцца і даруюцца асабістыя грахі, якія зрабіў чалавек (калі гаворка ідзе аб дарослым). Таксама ачышчаецца першародны грэх, які здзейснілі Адам і Ева (а гэта ўжо датычыцца ўсіх, уключаючы нованароджаных). Але вельмі важна разумець, што хрышчэнне — гэта не самадастатковы абрад, які здольны нешта змяніць да лепшага ў жыцці сям'і незалежна ад удзелу людзей (дарослага, які прымае хрышчэнне, альбо бацькоў і хросных немаўляці), іх веры і ўсведамлення імі дакладных мэт і намераў. Дзверы ў Храм адчыняюцца кожнаму, але каб увайсці, трэба гэтага хацець. Чыста механічна, без унутранай уцягнутасці (калі дзіця хрысціць «на ўсялякі выпадак» або «таму што ўсе так робяць») гэты абрад «не працуе». Як і любое царкоўнае таінства, зрэшты.

> **«Калі мы вернемся да вытокаў і сэнсу, які першапачаткова быў укладзены ў гэтае паняцце, то ўбачым, што функцыя хросных бацькоў у тым, каб перадаць дзіцяці веды і вопыт духоўнага жыцця. Менавіта да іх хрэснік павінен звяртацца з любымі складанымі пытаннямі — у тым ліку і з пытаннямі, якія ляжаць у сферы этыкі, маралі і веры».**

***—- Калі хрышчэнне «змывае» грахі, навошта Хрысту трэба было хрысціцца? Бо ён жа бязгрэшны...***

— У дачыненні да Хрыста сітуацыя іншая. У Хрысце мы прызнаем, вызнаем дзве прыроды — Боскую і чалавечую. Гасподзь не меў патрэбы ў ачышчэнні ад грахоў, таму што Ён іх не здзяйсняў. Хрыстос быў ва ўсім падобны да чалавека, акрамя граху. Калі здзяйснялася хрышчэнне Госпада ў рацэ Іардан, Святы Прарок Іаан Хрысціцель разумеў, хто перад ім знаходзіцца, і казаў пра тое, што не варты здзяйсняць абрад Хрышчэння Гасподняга. Але Гасподзь адказаў: «Нам належыць выканаць усякую праўду». Такім чынам Гасподзь паказаў прыклад людзям. Ён казаў пра тое, што «прыйшоў не парушыць Закон, але выканаць». Таму ён прайшоў абрад хрышчэння, і ў гэты момант было з'яўленне Святой Тройцы, і голас быў чутны: «Гэта Сын Мой любімы».

### ПАЧАТАК ШЛЯХУ

***— У якім узросце трэба хрысціць дзяцей? Некаторыя лічаць, што неабходна хрысціць немаўлят (такіх большасць), іншыя — што гэта павінна быць свядомым рашэннем у тым ліку падрослага дзіцяці. Хто мае рацыю?***

— Хрысціцца не позна ў любым узросце. Але яшчэ з апостальскіх часоў існуе практыка хрышчэння з самага ранняга ўзросту. Ёсць традыцыя здзяйсняць хрышчэнне на саракавы дзень, можна прымеркаваць яго да свята або да важнай даты ў жыцці сям'і. Але ў цэлым логіка такая: мы не адкладваем хрышчэнне, мы хочам, каб нованароджаны чалавек адразу стаў часткай Царквы, каб яго можна было прычашчаць і здзяйсняць пра яго малітвы. У нашы дні бацькоў нярэдка хвалюе пытанне аб тым, што маленькія дзеці несвядома прымаюць хрышчэнне. Гэта так, але разам з імі ў таінстве бяруць удзел хросныя бацькі. Яны паручаюцца перад Царквой, што зробяць усё магчымае, каб вера гэтага чалавека па меры яго сталення станавілася свядомай. Каб, падрастаючы, ён разумеў, да якой веры ён належыць.

***— Як бацькам падрыхтавацца да хрышчэння дзіцяці? Калі дзіця хрысціцца ў свядомым узросце — як яго правільна падвесці да таінства хрышчэння?***

— Ва ўсіх храмах праводзяцца падрыхтоўчыя гутаркі. Перш за ўсё на іх запрашаюць хросных бацькоў, а таксама маці і бацьку дзіцяці. Звычайна праводзіцца адна, дзве ці тры гутаркі — у розных храмах па-рознаму. У старажытнай царкве падрыхтоўка дарослага чалавека, які хацеў прыняць хрышчэнне, займала некалькі гадоў. Чалавек прыходзіў у храм, вывучаў багаслоўе, Святое Пісанне, асновы праваслаўя, і толькі пасля гэтага, ужо свядома, браў удзел у Таінстве Хрышчэння. Сёння Царква паступова аднаўляе практыку пашырэння ведаў аб праваслаўі, перш чым чалавек прыме хрышчэнне.

***— У нашы дні часам дзяцей хрысцяць, каб дагадзіць модзе, або «на ўсялякі выпадак», успрымаючы хрышчэнне як нейкі магічны абярэг малога ад хвароб. У гэтым выпадку ў хрышчэнні няма вялікага сэнсу?***

— Сапраўды, з такім падыходам прыходзіцца сутыкацца даволі часта. Мы робім усё магчымае, каб праз гутаркі, якія папярэднічаюць Таінству Хрышчэння, перадаць асноўныя, базавыя веды, неабходныя людзям, што вырашылі хрысціць сваё дзіця або прыняць хрышчэнне ў дарослым узросце. І самае галоўнае, што важна ўсведамляць: хрышчэнне не з'яўляецца самадастатковым абрадам. Часам, задаючы бацькам пытанне «Навошта вы хочаце хрысціць ваша дзіця?», я атрымліваю адказы: «Каб не хварэла», «Каб не плакала па начах» і нават «Каб не сурочылі». Але сэнс таінства ў іншым. Хрышчэнне, як я ўжо казаў, гэта дзверы, то-бок пачатак шляху. Мяркуецца, што пасля хрышчэння будзе працягвацца духоўнае станаўленне і развіццё дзіцяці, якога хрысцілі. Што яно будзе, падрастаючы, прыходзіць у храм, наведваць нядзельную школу, удзельнічаць у богаслужэннях, стане паўнавартаснай часткай Царквы, у якой ахрышчанае. І гэта галоўнае, што павінны зразумець бацькі.

Сёння мы хрысцім усіх, хто просіць пра гэта: у сучасным грамадстве наогул рэдка сустрэнеш нехрышчанага чалавека. Але свядомы, глыбокі падыход да хрышчэння сустракаецца вельмі рэдка. Што ж, хрышчэнне — у любым выпадку гэта добра для чалавека. Мяне таксама хрысцілі калісьці, «таму што ўсе хрысцяць». Мае бацькі не былі глыбока веруючымі людзьмі. І я свядома прыйшоў да веры, будучы ўжо дарослым. Хрышчэнне — гэта пачатак шляху да выратавання душы. Па гэтым шляху чалавек павінен ісці сам. Але калі яго не хрысціць, магчыма, гэтага шляху ён наогул не знойдзе...

***— А як бацькам падрыхтавацца да хрышчэння дзіцяці, так бы мовіць, «на фізічным узроўні»? Ці трэба, напрыклад, перад таінствам пасціцца?***

— Напярэдадні хрышчэння бацькоў і будучых хросных запрашаюць паўдзельнічаць у богаслужэнні. Хрышчэнне праходзіць па суботах, і бацькам прапануецца прыехаць крыху раней, каб узяць удзел у літургіі. Адразу пасля богаслужэння праходзіць Таінства Хрышчэння. Тады мы бачым, што сям'я не падыходзіць да пытання фармальна і імкнецца далучыцца да царкоўнага жыцця.

> **«У нашы дні бацькоў нярэдка хвалюе пытанне аб тым, што маленькія дзеці несвядома прымаюць хрышчэнне. Гэта так, але разам з імі ў таінстве бяруць удзел хросныя бацькі. Яны паручаюцца перад Царквой, што зробяць усё магчымае, каб вера гэтага чалавека па меры яго сталення станавілася свядомай».**

### АБ ХРОСНЫХ БАЦЬКАХ

***— Як правільна выбіраць хросных бацькоў? У чым іх значэнне? Што яны павінны рабіць для хроснага сына ці дачкі?***

— На жаль, на практыцы часта атрымліваецца так, што хросныя бацькі, якіх выбіраюць сем'і ў нашы дні, далёка не заўсёды знаёмыя з традыцыямі праваслаўнай царквы. Мы стараемся настроіць хросных падчас гутарак, каб яны разам са сваімі хрэснікамі духоўна раслі і пашыралі веды ў галіне праваслаўя — і маглі дзяліцца гэтым вопытам са сваімі хроснымі дзецьмі. Галоўная задача хросных — паручыцца перад Богам за дзіця і выканаць сваё абяцанне. Калі спытаць, у чым мэты хросных, вельмі часта можна пачуць адказ: «Калі з бацькамі нешта здарыцца, хросныя павінны замяніць іх для хрэсніка». Гучыць высакародна і дастойна, але на практыцы, на жаль, гэта часта ні ў чым не выяўляецца. Часцей за ўсё да сваіх задач хросныя ў нашы дні падыходзяць фармальна: абмяжоўваюцца віншаваннем хрэсніка з днём нараджэння. Але калі мы вернемся да вытокаў і сэнсу, які першапачаткова быў укладзены ў гэтае паняцце, то ўбачым, што функцыя хросных бацькоў у тым, каб перадаць дзіцяці веды і вопыт духоўнага жыцця. Менавіта да іх хрэснік павінен звяртацца з любымі складанымі пытаннямі — у тым ліку і з пытаннямі, якія ляжаць у сферы этыкі, маралі і веры. І хросны павінен быць гатовы адказаць на гэтыя пытанні — пра жыццё, і ў тым ліку пра царкоўнае жыццё. Хросныя бацькі — гэта вельмі сур'ёзная адказнасць. Гэта ганаровае званне накладвае абавязацельствы. Клопат пра хрэснікаў павінен праяўляцца не ў абстрактных фармулёўках: «Калі нешта здарыцца, мы дапаможам», а ў канкрэтных рэчах. Важна маліцца аб хрэсніку і ў храме, і ў хатняй малітве, запрашаць яго на богаслужэнні па святах, выбіраць «правільныя» падарункі — у першую чаргу не для забавы, а для духоўнага росту (напрыклад, кнігу, а не цацку). І ў цэлым рабіць усё, каб дзіця пры дапамозе хросных бацькоў магло адкрыць свет веры і Бога.

***— Ці выконваюць хросныя ўскладзеныя на іх абавязацельствы ў нашы дні?***

— Я бачу, што ўсё больш людзей імкнецца выходзіць за рамкі фармальнага клопату пра хрэснікаў, выдаткоўваюць сваім хросным дзецям сапраўды шмат часу і сіл, клапоцяцца, каб малыя і падлеткі спазнавалі веру. Дарэчы, у старажытнасці нават дарослы чалавек, прымаючы хрышчэнне, павінен быў выбраць хросных бацькоў. Цяпер для асобы, старэйшай за 14 гадоў, хросныя ўжо не абавязковыя. Хоць і ў нашы дні лепш, калі побач з навахрышчаным будуць дасведчаныя людзі, гатовыя дапамагчы яму ў любой сітуацыі, падтрымаць і накіраваць на духоўны шлях.

### З ПАПРАЎКАЙ НА КОВІД

***— Калі казаць непасрэдна аб абрадзе хрышчэння: у сувязі з халодным надвор'ем і эпідэмічным становішчам некаторыя мамы вырашаюць дачакацца вясны...***

— Ва ўмовах пандэміі ва ўсіх праваслаўных храмах выконваюцца неабходныя меры бяспекі. Хрышчэнне звычайна здзяйсняецца індывідуальна для кожнай сям'і. У любым выпадку, гэта асобнае цёплае памяшканне, вада ў купелі падаграваецца. Зімой, відома, для маленькага дзіцяці пажадана, каб царква, дзе яго будуць хрысціць, размяшчалася недалёка ад дома. А ў цэлым, я не бачу ніякіх перашкод да таго, каб хрысціць дзіця зімой.

***— Для святара хрышчэнне — складаны абрад?***

— І складаны, і радасны. Адзін святар расказваў мне, як няпроста яму было, калі ён быў толькі-толькі пасвячоны ў сан і пры гэтым накіраваны служыць у вялікі сабор, дзе часам даводзілася хрысціць адначасова больш за 20 дзяцей. Разам з тым заўсёды падчас таінства хрышчэння святар адчувае велізарную радасць. Бо ўсе гэтыя цудоўныя дзеткі ўпершыню наведваюць храм (няхай пакуль і несвядома), адкрываюць для сябе духоўны свет, упершыню сустракаюцца з Богам. І гэта, безумоўна, робіць такі дзень незабыўным-неверагодна важным для ўсіх удзельнікаў Таінства Хрышчэння.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# ДЗІЦЯЧЫЯ МАНІПУЛЯЦЫІ: ТАКТ І ТАКТЫКА



**Заяўляць пра сябе, адстойваць свае інтарэсы — вельмі важна для кожнага з нас. Але што адбываецца, калі так паводзяць сябе нашы дзеці? Правільна, мы пачынаем іх выхоўваць, вучыць жыццю — назавіце, як пажадаеце, але галоўнае застанецца за кадрам. Мы, дарослыя, не заўсёды бачым сапраўдную прычыну слёз, істэрык і незадаволенасці нашых дзяцей і насамрэч часта самі падштурхоўваем іх да такой рэакцыі. А выснову робім хутка: малое ж проста маніпулюе намі! Разабрацца з тым, ці існуе на самай справе дзіцячая маніпуляцыя, адкуль узнікае і ў што можа выліцца, спрабуем з псіхолагам.**

Амерыканскі вучоны Эверэт Леа Шострам, аўтар кнігі «Чалавек-маніпулятар», вылучае цэлых пяць тыпаў дзяцей-маніпулятараў. Так, некаторыя прыцягваюць да сябе ўвагу слязамі, іншыя — крыкам і істэрыкамі, а хтосьці — нават паказной слабасцю... У цэлым жа спецыялісты маюць розныя меркаванні адносна таго, ці існуе дзіцячая маніпуляцыя. Самім бацькам таксама бывае няпроста ўбачыць за паводзінамі любімых дзяцей праяву пэўнай тактыкі, якая дазваляе дабіцца свайго.

— Я як псіхолаг заўсёды кажу бацькам пра тое, што трэба шукаць прычыну маніпуляцыі. У вучоных розныя меркаванні наконт існавання такой з'явы, як дзіцячая маніпуляцыя. Некаторыя лічаць, што дзеці не здольныя на гэта, бо іх мозг яшчэ не настолькі выспеў і не можа прадумваць дзеянні наперад і рабіць падобнае асэнсавана. Таму, хутчэй за ўсё, нашы дзеці пачынаюць так сябе паводзіць, калі бачаць аналагічную мадэль ва ўчынках дарослых. З часам такі сцэнарый замацоўваецца, бо, калі ўвогуле разглядаць маніпуляцыю, гэта пэўная тактыка, стратэгія кіравання дзеяннямі ці ўчынкамі іншага чалавека. І дзіця гэтага не разумее. А вось тое, што задача маніпулятара — дасягнуць жаданага, дзіця можа пераканацца, калі яно заплакала, і бацькі тут жа звярнулі ўвагу, далі любімую цацку ці ўключылі мульцік, — расказвае **псіхолаг Вера ПРОХАРЧЫК**. — Разумеючы, як працуе такі ланцужок, дзіця навучаецца гэтаму. Таму дзіцячая маніпуляцыя мае на мэце ўздзейнічаць на бацькоў такім чынам, каб выклікаць у іх патрэбную рэакцыю.

Атрымліваецца, што ўсё пачынаецца з выхавання. І ўжо падчас першай такой спробы дзіцяці дабіцца жаданага нам, дарослым, трэба вельмі ўважліва рэагаваць. Напрыклад, сын ці дачка заплакалі. І адразу, каб супакоіліся, ім далі тое, чаго дзеці хацелі, — цукерку, мульцік уключылі і г. д. Усё: лічыце, механізм «я раблю так і атрымліваю, што хачу» спрацаваў. Аднак усё ж лепш пайсці іншым шляхам. Варта вучыцца і вучыць сваё дзіця размаўляць, высвятляць прычыны і дамаўляцца. Перш за ўсё для таго, каб прапрацоўваць сапраўдныя прычыны нежаданых паводзін. Вядома, бацькам вельмі складана не сарвацца на эмоцыі, калі іх дзіця плача, злуецца, але ў такія моманты трэба праяўляць стойкасць і заставацца спакойнымі.

— У паводзінах дзяцей вельмі важна ўмець бачыць іх патрэбы. Калі ў краме малое просіць піражнае, а мама яго ігнаруе, а не тлумачыць, чаму пакупку не здзейсніць, то будуць слёзы і істэрыка. Лепш скажыце, што сёння не планавалі купляць дэсерт, але абавязкова зробіце гэта наступным разам. Альбо прагаварыце той момант, што вы бачыце, як дзіця засмуцілася, і гатовыя яго суцешыць. А калі ж на дзяцей зусім не рэагуюць ці робяць гэта таксама эмацыянальна, то не варта чакаць, што сын ці дачка супакояцца і прыслухаюцца да вас, — тлумачыць спецыяліст. — Калі гаварыць пра ўзроставыя рамкі, дзе дзіцячую маніпуляцыю можна ўжо прасачыць, то да мяне звяртаюцца з дзецьмі ўжо 2,5-3 гадоў. У час трохгадовага крызісу, які з'яўляецца важным этапам развіцця маленькага чалавека, адбываецца яго адасабленне ад бацькоў, пачынае праяўляцца і дзіцячы негатывізм, нязгода з чымсьці. На фоне гэтага прадухіліць маніпуляцыі можна, калі прапаноўваць дзіцяці выбар і месца ў ўвазе, што нязгода з вамі — нармальная з'ява для дадзенага перыяду. У адваротным выпадку, дзе будзе гучаць толькі бацькоўскае «не, таму што я так сказала!», вы пазбаўляеце сваё дзіця магчымасці навучыцца адстойваць уласныя інтарэсы і заяўляць пра сябе.

У падлеткавым узросце дзіцячая маніпуляцыя набывае ўжо зусім іншыя адценні. Там маме важна ўжо не проста з павагай ставіцца да выбару сына альбо дачкі, але і не баяцца эмоцый. Часам менавіта ад страху бацькі дазваляюць дзецям тое, што было пад забаронай. Тут трэба мець мудрасць і цярпенне, каб не страціць бацькоўскі аўтарытэт. Падлеткавы ўзрост — гэта таксама крызісны час для фарміравання асобы. І ў такі час, як увогуле і да гэтага, за істэрыкай, агрэсіўнымі паводзінамі можа хавацца жаданне дзіцяці задаволіць сваю патрэбу ў клопаце, любові, увазе, падтрымцы і блізкасці. Ад балансу ў тым, ці зможа дарослы разгледзець такі «пасыл» і выслухаць падлетка, растлумачыць яму сітуацыю, дамовіцца аб сумесных дзеяннях, і залежыць лёс «маніпуляцыйнай тактыкі» ў вырашэнні любых пытанняў.

Любая маніпуляцыя хутка перастае дзейнічаць, калі яе не падтрымліваюць. Разам з тым тут ёсць адна важная акалічнасць. Тое, што бацькі могуць успрымаць і характарызаваць як маніпуляцыю (у сілу розных прычын, у тым ліку і свайго ўласнага дзіцячага вопыту), насамрэч можа з'яўляцца асаблівасцю рэакцыі нервовай сістэмы канкрэтнага дзіцяці альбо такі «выхад» знаходзіць назапашаная стомленасць яго арганізма. Просты прыклад: нядаўна забірала сына з садка, і ўжо на выхадзе ён раптам заявіў, што хоча застацца там і не ісці дадому. Пачаў плакаць і ўпірацца, адмаўляючыся рэагаваць на маё «Пойдзем дадому». Побач ішла яго выхавацелька. І першая мая думка была: «Якое меркаванне ў яе складзецца пра нашу сям'ю, калі дзіця не хоча ісці дадому?» Пасля пачала супакойваць сына і неяк угаварыла пайсці на аўтобус. Толькі праз некалькі гадзін падчас размовы мне ўдалося высветліць, што ён проста пакрыўдзіўся, бо яго забралі з садка апошнім. Высновы з той сітуацыі ў мяне дзве. Па-першае, я ледзь сама не паддалася эмоцыям, таму што думала пра думкі людзей побач, якія назіралі нашу сітуацыю. Па-другое, я прасіла сына супакоіцца, а не спрабавала знайсці прычыну яго нечаканых паводзін. Пасля ўжо задумалася, якой на самай справе можа быць тонкай мяжа паміж маніпуляцыяй і жаданнем быць пачутым дарослымі...

— Там, дзе няма маніпуляцыі, дзеці ў прынцыпе нічога не патрабуюць. Напрыклад, вось сітуацыя з дзіцячым садком. Калі дзіця заяўляе, што хоча застацца там, то даросламу важна спыніцца, не ўпадаць у пачуццё віны, разабрацца ў сітуацыі. Можа, малы не нагуляўся, а магчыма, гэта якраз азначае, што цэлы дзень дзіця было ў садку і там паводзіла сябе добра, выконвала ўсе патрабаванні, а цяпер дэманструе бацькам свой пратэст і незадаволенасць, — тлумачыць Вера Васільеўна. — Тут вельмі многае залежыць зноў ад рэакцыі бацькоў. Не варта адразу ж кідацца і выконваць патрабаванне дзіцяці, бо так вы якраз падмацуеце маніпулятыўныя паводзіны. Дайце яму пражыць яго эмоцыі і навучыце з імі спраўляцца. Можна абняць і паспрабаваць пагаварыць, а можна паклікаць вярнуцца ў садок альбо пайсці пагуляць на дзіцячую пляцоўку. Часта рысы маніпулятыўных паводзін з'яўляюцца там, дзе дзіця не ўмее па-іншаму сказаць пра сваю злосць, страх ці нейкія іншыя пачуцці.

...Добрую глебу для разважанняў, калі мы гаворым пра дзіцячыя маніпуляцыі, дае і тое, што калі падобны стыль паводзін дзеці пераймаюць у сям'і, дзе ўсе гэта перыядычна практыкуюць, то ёсць верагоднасць, што і ў дарослым жыцці яны будуць у такім жа фармаце будаваць свае адносіны з іншымі людзьмі. Калі дзеці назіраюць маніпуляцыю як пастаянны спосаб узаемадзеяння, то пачынаюць успрымаць гэта як норму. Мама, напрыклад, кажа, што дзіця атрымае цукерку, калі з'есць кашу, — вось вам маніпуляцыя ў дзеянні. У рэшце рэшт, часам даросламу зрабіць так прасцей, чым прыдумваць цікавыя рэцэпты ці тлумачыць важнасць правільнага харчавання. І так ва ўсім. Але ад таго, што мы, бацькі, закладзём нашым дзецям у якасці арыенціраў, будзе залежаць іх узаемадзеянне з намі ды з іншымі і тут, і цяпер, і ў перспектыве.

**Алена ДРАПКО.**

### Што пачытаць па тэме?

• Людміла Петраноўская «Таемная апора».

• Боні Харыс «Калі дзеці кіруюць намі».

### РЭКАМЕНДАЦЫІ, ЯК ПРАДУХІЛІЦЬ ДЗІЦЯЧЫЯ МАНІПУЛЯТЫЎНЫЯ ПАВОДЗІНЫ:

1. Рэагуйце спакойна. Дачакайцеся, пакуль дзіця пойдзе на кантакт з вамі. Але ні ў якім разе не крычыце і не прымяняйце фізічную сілу, бо станоўчага выніку такая тактыка не дасць.

2. Імкніцеся зразумець і прымаць пачуцці, якія рухаюць вашым дзіцём у дадзенай сітуацыі. Агучвайце яму, што яно адчувае (ты пакрыўдзіўся, засмуціўся, злуешся), каб даць сігнал, што вы яго падтрымліваеце, чуеце.

3. У размове старайцеся патлумачыць, што дзіця робіць няправільна, але ацэньвайце толькі ўчынак, а не асобу.

4. Памятайце пра ўзроставыя асаблівасці дзіцяці і самі пазбягайце маніпулятыўнага стылю ў адносінах да сына ці дачкі.

5. Што б ні здарылася, пражывайце эмоцыі дзіцяці разам з ім. Менавіта ваша ўзаемадзеянне з дзецьмі ў такія моманты самае галоўнае, а не меркаванні і рэакцыя тых, хто побач.

---

Спытайце ў псіхолага

# ШТО НЕЛЬГА РАБІЦЬ ПАСЛЯ РАЗВОДУ

**«Сяброўка падала заяву на развод з мужам. Расталіся яны не ворагамі. Але і не сябрамі, як бы ёй хацелася. Іх агульнаму сыну — 5 гадоў, ён застаўся жыць з мамай. Жанчына робіць усё магчымае, каб хлопчык не мага часцей кантактаваў з татам, тым больш што ў іх цудоўныя адносіны. Больш за тое, сяброўка хоча, каб яны хоць зрэдку, але бавілі час утраіх, таму сама ініцыюе розныя сумесныя мерапрыемствы. У прыватнасці, купіла білеты ў філармонію, прапанавала былому мужу, які прывёў сына з прагулкі, разам зайсці ў піцэрыю... Я вельмі перажываю за сяброўку. Скажыце, ці правільна яна робіць? І як правільна разводзіцца, каб не траўмаваць дзяцей?»**

*Кацярына М., г Мінск.*

**На пытанне адказвае дзіцячы псіхолаг Людміла ГУБСКАЯ:**

«Ваша сяброўка заняла пазіцыю ахвяры: «Я буду цярпець дзеля дзіцяці». Не разумею, навошта ёй гэта? Тым больш яе сыну ад гэтага не будзе ніякай карысці. Ён жа бачыць і адчувае, што паміж бацькамі не самыя добрыя адносіны.

Ёсць некалькі правілаў для пары, якая развялася. Вы больш не муж і жонка, але па-ранейшаму мама і тата, таму размаўляйце толькі на тэмы, якія датычацца выключна вашага дзіцяці. Гэта дапаможа наладзіць экалагічныя зносіны і пазбегнуць канфліктаў.

Акрамя таго, раю не тлумачыць дзіцяці, пакуль не вырасце, гадоў да 15, прычыны вашага разводу. Тым самым вы засцерагаеце малое ад імкнення прыняць чыйсьці бок. Проста скажыце, што «мы, дарослыя людзі, прынялі такое рашэнне — не жыць разам». «Тата будзе жыць асобна, але ён вельмі цябе любіць, і вы будзеце бачыцца». Растлумачце дзіцяці, што яно тут ні пры чым. Абавязкова прагаварыце гэты момант, бо ў перыяд дзіцячага эгацэнтрызму, 4-7 гадоў, усе падзеі падаюцца дзіцяці звязанымі з ім, таму яно можа адчуць сябе вінаватым у вашым разводзе. У 15 гадоў можна растлумачыць, чаму вы расталіся, але толькі ў тым выпадку, калі падлетак запытаецца. Некаторыя, падрастаючы, кажуць: «А я не хачу нічога ведаць. Чаму гэта мяне навучыць?»

Не скардзіцеся дзіцяці адно на аднаго. Не ўцягвайце яго ў свае стасункі. Дзеці не павінны адчуваць сваю адказнасць за адносіны паміж дарослымі. Гэта датычыцца любой сям'і, нават той, якая жыве ў гармоніі. Калі мама з татам пасварыліся, і нехта імкнецца, каб дзіця прыняло яго бок, гэта таксама праблема. Адносіны паміж бацькамі не павінны ўплываць на дзяцей. Гэта вашы дарослыя адносіны».

Запісала **Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

## Информационное сообщение о проведении открытого аукциона по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в населенных пунктах Курганского сельсовета Смолевичского района Минской области

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Дата, время и место проведения аукциона | **21 марта 2022 года в 15.00, индекс 222230, д. Курганье, ул. Центральная, 8, Курганский сельисполком, зал заседаний** |
| 2 | Форма проведения | Открытый |
| 3 | Продавец и его адрес | Курганский сельский исполнительный комитет, дер. Курганье, ул. Центральная, дом 8, Смолевичского района Минской области |
| 4 | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес, наличие инженерной инфраструктуры, начальная (стартовая) цена продажи | **Лот № 1** – аг. Алесино, **0,1399 га**, кадастровый № *624882500101000360*; возможность подключения электроснабжения, водоснабжения, газоснабжения; 9 000 BYN.<br>**Лот № 2** – аг. Кленник, **0,1499 га**, кадастровый № 624882505601000175; возможность подключения электроснабжения, водоснабжения, газоснабжения; 8 500 BYN.<br>**Лот № 3** – аг. Кленник, **0,1500 га**, кадастровый № 624882505601000170; возможность подключения электроснабжения, водоснабжения, газоснабжения; 7 800 BYN.<br>**Лот № 4** – дер. Стриево, **0,1495 га,** кадастровый № 624882510601000016; возможность подключения электроснабжения; 5 000 BYN.<br>**Лот № 5** – дер. Студенка, **0,1226 га**, кадастровый номер № 624882511101000236; возможность подключения газоснабжения, электроснабжения; 7 500 BYN |
| 5 | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6 | Целевое назначение | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02) – земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) |
| 7 | Расходы по организации и проведению аукциона | Лот № 1 – градостроительный паспорт – 866,58 BYN; землеустроительное дело – 1185,88 BYN; государственная регистрация – 110,20 BYN.<br>Лот № 2 – градостроительный паспорт – 616,71 BYN; землеустроительное дело – 901,38 BYN; государственная регистрация – 63,00 BYN.<br>Лот № 3 – градостроительный паспорт – 515,59 BYN; землеустроительное дело – 891,76 BYN; государственная регистрация – 63,00 BYN.<br>Лот № 4 – градостроительный паспорт – 476,57 BYN; землеустроительное дело – 688,56 BYN; государственная регистрация – 58,80 BYN.<br>Лот № 5 – градостроительный паспорт – 611,17 BYN; землеустроительное дело – 836,42 BYN; государственная регистрация – 63,00 BYN.<br>+ затраты за публикацию информационного сообщения о проведении аукциона. Затраты на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам, подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных в соответствии с Указом «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры» |
| 8 | Условия аукциона | а ) продажа по цене не ниже начальной;<br>б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь постоянно проживающие на территории Республики Беларусь или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательством Республики Беларусь;<br>в) без права предоставления рассрочки;<br>г) возместить затраты на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку, в порядке и случаях, предусмотренных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 г. № 298;<br>д) при подаче заявления на определенный лот только одним участником, земельный участок продается по начальной цене, увеличенной на 5 %;<br>е) наличие не менее двух участников;<br>ж) получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство одноквартирного жилого дома;<br>з) приступить к занятию (освоению) земельного участка в течение одного года со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения прав на него;<br>и) возместить затраты на изготовление правоудостоверяющих документов |
| 9 | Ограничения в использовании | Лот № 1 – участки, расположенные в охранных зонах линий связи и радиофикации (площадь – 0,0021 га), участки, расположенные на мелиорируемых землях (площадь – 0,1399 га) |
| 10 | Условия оплаты | За безналичный расчет в течение 10 рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 11 | Сумма задатка и реквизиты продавца | *Получатель: Курганский сельский исполнительный комитет, 10 % от начальной (стартовой) цены земельного участка р/с BY26AKBB 36046270518946200000, ЦБУ № 621, ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Смолевичи, ул. Советская, 130а, БИК FRDDDY2X, УНП 600023808 (с пометкой «задаток за земельный участок»)* |
| 12 | Порядок предвар. ознак. на местности с зем. участком | Каждая среда с 10.00 до 13.00 |
| 13 | Начало приема документов | С 21 февраля 2022 года в рабочие дни ежедневно |
| 14 | Окончательный срок приема документов | 15 марта 2022 года в 17.30 |
| 15 | Контактные телефоны | 8-01776-24-293, 24-292 |

**Извещение о проведении аукциона опубликовано на сайте Минского областного центра инвестиций и приватизации – www.rlt.by**

Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения результатов аукциона внести плату за земельный участок, а также возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона (лот № 1 – 2162,66 BYN; лот № 2 – 1581,09 BYN; лот № 3 – 1470,35 BYN; лот № 4 –1223,93 BYN; лот № 5 – 1510,59 BYN).

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт и его копия) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае если интересы покупателя представляет это лицо).

## Информация о проведении 23 марта 2022 г. 103-го открытого аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков в Солигорском районе

| № лота | 1 | 2 | 3 |
|---|---|---|---|
| Предмет аукциона | Право заключения договора аренды земельного участка | | |
| Адрес земельного участка | Минская обл., Солигорский р-н, Старобинский с/с, д. Листопадовичи, район земельного участка по ул. Майская, 2Б | Минская обл., Солигорский р-н, Старобинский с/с, г. п. Старобин, ул. Молодежная | Минская обл., Солигорский р-н, г. Солигорск, ул. Ковалёва, район дома № 11 |
| Кадастровый номер | 625086200601000490 | 625086290501000003 | 625050100001003266 |
| Площадь, га | 0,2445 | 0,6924 | 0,0138 |
| Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества (целевое назначение) | размещение объектов усадебной застройки (строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома) | размещение объектов многоквартирной жилой застройки (строительство и обслуживание многоквартирного жилого дома по ПДП № 2 и инженерных коммуникаций к нему) | размещение объектов иного назначения (строительство и обслуживание велосипедной стоянки) |
| Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории* | имеется подъезд с грунтовым покрытием, возможность подключения к сетям связи, электроснабжения, газоснабжения | инженерная и транспортная инфраструктура в процессе строительства, имеется возможность подключения ко всем инженерным сетям | имеется развитая инженерная и транспортная инфраструктура |
| Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций и сооружений | охранные зоны электрических сетей – 0,0001 га, природные территории, подлежащие специальной охране (водоохранные зоны рек и водоемов) – 0,2445 га | ограничений в использовании земель нет | охранные зоны электрических сетей напряжением до 1000 вольт – 0,0009 га, свыше 1000 вольт – 0,0018 га |
| Начальная цена продажи, рублей | 676,65 | 23 342,54 | 557,18 |
| Сумма задатка, рублей | 135,00 | 4 668,00 | 111,00 |
| Срок аренды земельного участка / условия продажи | 30 лет / см. пункт 6 извещения о проведении аукциона** | 50 лет / 1. после ввода объекта в эксплуатацию безвозмездно передать в собственность Солигорского района жилые помещения типовых потребительских качеств в количестве 7 процентов общей площади (на основании подпункта 1.5 пункта 1 решения Минского облисполкома от 14 ноября 2014 г. № 978); 2. см. пункт 6 извещения о проведении аукциона** | 10 лет / см. пункт 6 извещения о проведении аукциона** |
| Затраты на организацию и проведение аукциона, рублей | 3 050,10 | 4 154,10 | 2 655,77 |
| | + затраты на объявление в СМИ | | |

**Организатор аукциона: Солигорский районный исполнительный комитет, г. Солигорск, ул. Козлова, 35.**
**Контактные телефоны: 8 (0174) 23 73 86, 23 73 24.**
**Аукцион состоится в 15.00 23 марта 2022 г. по адресу: г. Солигорск, ул. Козлова, 35, зал заседаний райисполкома.**

**В разделе указаны коммуникации, к которым возможно подключение в указанном населенном пункте (массиве застройки). Подключение к указанным коммуникациям возможно только в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выдаваемыми эксплуатирующими и согласующими организациями. Возмещение затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам осуществляется на основании решения Солигорского районного исполнительного комитета от 11 февраля 2020 г. № 244.*

***Извещение о проведении аукциона опубликовано на официальных сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – www.gki.gov.by (https://au.nca.by), Минского областного исполнительного комитета – www.minsk-region.gov.by (Главная/Экономика и финансы/Земельные участки и извещения о проведении аукционов), Солигорского районного исполнительного комитета – www.soligorsk.gov.by (Главная/Экономика и бизнес/Инвестору/Аукционы).*

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

## Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ликвидатора ОАО «Передвижная механизированная колонна № 32» (222310, Минская обл., г. Молодечно, ул. Молодежная, 2Б) проводит открытый аукцион по продаже имущества в составе:

| № лота | Наименование | Инв. № | Начальная цена, с НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
«Наш вопыт красамоўна сведчыць, што ў перыяды канструктыўных палітычных адносін нам удавалася дабіцца значных поспехаў ва ўсіх сферах двухбаковага супрацоўніцтва, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Ведаю, літоўцы падтрымліваюць Беларусь, якая ідзе па шляху міру і эвалюцыйнага развіцця. Веру, у хуткім часе літоўскі народ рэалізуе свае канстытуцыйныя правы, што дасць магчымасць справіцца з цяжкасцямі, якія перашкаджаюць нам сёння развіваць эфектыўнае ўзаемадзеянне».

Прэзідэнт пажадаў дружалюбнаму народу Літвы мірнага неба, найхутчэйшага пераадолення ўнутраных супярэчнасцяў і стваральнай працы на карысць сваёй Айчыны.

## Извещение акционеров ОАО «Лукомльэнергомонтаж» о проведении годового общего собрания акционеров Общества – 18 марта 2022 г.,

**расположенного по адресу: 211162, г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8, Витебская область, Чашникский район.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2021 году и основных направлениях деятельности Общества на 2022 год.
2. Об утверждении годового отчета Общества, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества, с учетом заключения ревизионной комиссии и аудиторского заключения.
3. Об утверждении распределения и использования прибыли (покрытия убытков), выплате дивидендов за 2021 год и направлений распределения прибыли на 2022 год и 1-й квартал 2023 года.
4. Об избрании членов Наблюдательного совета, Ревизионной комиссии.
5. Об утверждении условий вознаграждения членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
6. О приобретении Обществом акций собственного выпуска.
7. Об уменьшении уставного фонда Общества путем аннулирования акций, поступивших в распоряжение Обществом в целях сокращения их общего количества.
8. О внесении изменений в Устав Общества.

Регламент проведения собрания акционеров

Дата формирования реестра владельцев ценных бумаг, для составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, – **1 марта 2022 г**.

Время начала проведения собрания акционеров – **10.00.**

Место проведения собрания акционеров – **211162, г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8, Витебская область, Чашникский район, актовый зал Общества.**

Форма проведения собрания акционеров – **очная**.

Орган, созывающий собрание: **Наблюдательный совет**.

Регистрация участников собрания **с 09.00 до 09.45** в день по месту проведения собрания. Регистрация лиц, имеющих право на участии в собрании, осуществляется при предъявлении паспорта (другого документа, удостоверяющего личность), а представителю акционера – также документы, подтверждающие полномочия на участие в собрании.

С информацией (материалами), подлежащими представлению акционерам при подготовке к проведению собрания, акционеры могут ознакомиться ежедневно (кроме субботы и воскресенья) начиная с 26 февраля 2022 г. в бухгалтерии Общества с 13.00 до 16.00, в день проведения собрания с 09.00 до 09.45 – по месту его проведения.

**В случае отсутствия кворума на созываемом годовом общем собрании, повторное годовое общее собрание акционеров с той же повесткой дня будет проведено 25.03.2022, в 10.00 по адресу: 211162, г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8, Витебская область, Чашникский район.**

УНП 300007839

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

| | |
|---|---|
| **Организатор публичных торгов (аукциона)** | **ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 3Н Сайт в интернете: www.iin.by** |
| **Продавец** | **ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29** |

**Предмет публичных торгов (аукциона)**

| Лот № | Наименование | Начальная цена, бел. руб. с учетом НДС 20 % | Минимальная цена, бел. руб. с учетом НДС 20 % |
|---|---|---|---|
| **1** | **Капитальное строение** (склад-навес для готовой продукции) общей площадью 949,7 кв. м, инвентарный номер 342/С-67989 по адресу: Сосновоборский с/с, Светлогорский район, р.п. Сосновый Бор, ул. Заводская, 4/4 | 126 293,08 | 30 000,00 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48BELB30120001H00010226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 291442411, получатель платежа: **ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг торгов** на повышение начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) – 5 %.
В случае отсутствия ставок участников торгов начальная цена торгов поэтапно снижается равными долями 5 (пять) раз до минимальной цены или до момента совершения ставок участниками торгов

Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещен в открытом доступе на официальном сайте ООО «Индустрия Инноваций» www.iin.by

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после публичных торгов (аукциона)

**Условия оплаты предмета торгов (аукциона): 30 календарных дней** со дня заключения договора купли-продажи

**Торги проводятся в соответствии с регламентом ООО «Индустрия Инноваций», размещенным по адресу: www.iin.by**

Победитель публичных торгов (аукциона), либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **0,7 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) дней** после проведения публичных торгов (аукциона)

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона)

**Дата и время проведения торгов (аукциона)**
Начало торгов: 10.00 18.03.2022 г.
по адресу: г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 3Н

| | |
|---|---|
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в публичных торгах (аукционе) принимаются по 15.03.2022 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 3Н** |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95. E-mail: a.aleshkevich@iin.by** |

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «МЗОР», г. Минск, ул. Октябрьская, 16** |

**Предмет аукциона**
**Месторасположение – г. Минск, ул. Октябрьская, 16**

**Лот № 1**

Производственная база в составе: **производ. корпуса** (1130,5 кв. м, 500/С-49698; 4340,5 кв. м, 500/С-53224), **диспетчерская** (54,7 кв. м, 500/С-53818), **здание специализир. иного назначения (литейный цех)** (7664,8 кв. м, 500/С-47329), **компрессорная** (473,6 кв. м, 500/С-54017), **электропечь термическая** (39,8 кв. м, 500/С-54018), **здание весовой** (24,3 кв. м, 500/С-54019), **административно-хоз. корпус** (2323,4 кв. м, 500/С-49697, составные части: проезды, площадки, подкран. путь, дорожки, подпор. стены, бордюры, ограждения, ворота, калитка, лестница), **склад** (2328,4 кв. м, 500/С-53297), **склады** (895,5 кв. м, 500/С-53808), **склады, гаражи** (453,6 кв. м, 500/С-53897), **склады, администрат. помещения, агрегатные** (563,7 кв. м, 500/С-53846), **инженерный корпус** (3348,6 кв. м, 500/С-46093), **административно-производ. корпус № 4** (19710,5 кв. м, 500/С-53638), **склад** (2193,5 кв. м, 500/D-708019487), **строительный цех** (507,9 кв. м, 500/С-53845), **насосная станция автоматич. пожаротушения** (194,4 кв. м, 500/С-54016), **станция очистки сточных вод** (305,1 кв. м, 500/С-54015), **градирня** (39,1 кв. м, 500/С-55130), **ливневая канализац. сеть** (1077,5 м, 500/С-1029279), **хозяйственно-питьевая водопров. сеть** (973,2 м, 500/С-1029266), **тепловая сеть** (236,7 м, 500/С-1029272). **Иное имущество, входящее в состав лота:** газопровод внутрицеховой (инв. № 12050078), внеш. электроснабжение складского корпуса (инв. № 12020054), внутриплощадочные кабельные сети (инв. № 12020085), токопровод из алюминиевых шин 3-4 корп. (инв. № 12080111), площадка для складирования песка (гравий инв. № 11010193), склад баллонов с кислородом (инв. № 10020854), склад для хранения баллонов с аммиаком (инв. № 10020280), склад металлический (инструмент) (инв. № 10020810), склад макулатуры (инв. № 10020877), оборудование РП-2 (инв. № 13041173), конденсат. установки (инв. № 13041182, 13040277, 13040260, 13040159, 13040165), трансформатор силовой (инв. № 13041169), ТП (инв. № 13040099, 13040120), комплекты ТП (инв. № 13040082, 13040053, 13040030), комплект. распред устройство 6КВ (инв. № 13040024), конденсат. установка низ. напр. (инв. № 13040188), лифты груз. (инв. № 28240022, 28240013, 28240065, 28240036, 28240059, 28240042), лифт грузопас. (инв. № 28240071), объекты растительности: береза бородавчатая (инв. № 20054010), вишня 4 шт. (инв. № 20054002), груша (инв. № 20010005), яблоня (инв. № 20054008), липа мелколистная 3 шт. (инв. № 20054005), газоны 10 шт. (инв. № 20050404)

***Сведения о земельном участке***: предоставлен продавцу для размещения объектов иного назначения на праве временного пользования пл. **5,1481 га** (срок действия по 31.08.2029). ***Ограничения (обременения)*** прав на земельный участок: расположен в водоохран. зоне; в охран. зонах электрич. сетей (пл. 0,0134 га), зонах сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,5680 га), канализации (пл. 0,1920 га), теплоснабжения (пл. 0,0420 га), объектов газораспределит. системы (пл. 0,0024 га), недвижимых матер. историко-культур. ценностей (пл. 0,5035 га)

**Обременения по лоту № 1:** площади зданий частично сданы в аренду. Здания с инвентар. номерами 500/С-53224 (лот № 1), 500/С-46093 (лот № 1) находятся в залоге у банков. Более подробную информацию по залогу и арендаторам можно узнать у организатора аукциона.
На территории лота № 1 расположено защитное сооружение гражданской обороны, которое не входит в состав лота.
Покупатель одновременно с подписанием договора купли-продажи недвижимости заключает с Продавцом предварительный договор аренды на часть капитального строения, инв. № 500/С-49698 (комната № 4 (подстанция) 33,6 кв. м, и комната № 5 (подстанция) 52,0 кв. м). Договор аренды Покупатель обязуется заключить с Продавцом в течение 2 рабочих дней с момента перехода права собственности на объект недвижимости. С предварительным договором о заключении договора аренды части капитального строения можно ознакомится на сайте организатора аукциона www.cpo.by

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 19 669 731,31 бел. руб.**
(снижена на 30 %)

**Лот № 2**

Производственная база в составе: **заводоуправление** (2763,5 кв. м, 500/С-53298, составные части: проезд, дорожка, площадки, ограждение, бордюры), **производ. корпус** (13365,7 кв. м, 500/С-45217), **технологич. котельная** (200,30 кв. м, 500/С-53824), **тепловая сеть** (43,8 м, 500/С-1029271), **ливневая канализац. сеть** (547,1 м, 500/С-1029280), **хозяйственно-бытовая канализац. сеть** (161,3 и 169 м, 500/С-1029273, 500/С-1029277), **хозяйственно-питьевая водопров. сеть** (68,4 и 295,1 м, 500/С-1029269, 500/С-1029267). **Иное имущество, входящее в состав лота:** внутриплощад. каб. сети (инв. № 12020084), комплект. ТП (инв. № 13040065), конденсат. установка низ. напр. (инв. № 13040194), конденсат. установки (инв. № 13040294, 13040283, 13040171), шкафной газорегуляторный пункт (инв. № 11010728), низковольт. конденсат. установка (инв. № 13040225), токопровод из алюминиевых шин 1 корп. (инв. № 12080109), насосное оборудование АБК инв. № 28620483), электротехн. обор. АБК инв. № 13041331), комплект. трансф. подстанция, инв. № 13040076), контейнер универсальный 1СС (инв. № 25021204Д), склад металлический (веники) инв. № 10020802), низковольт. конденсат. уст-ка, инв. № 13040202), склад пропан-бутан, инв. № 10020144), телефон. канализ. и смотр. устр., инв. № 12030041), забор из сетки рабицы, инв. № 11010800), склад металлический (для электрокары), инв. № 10020825), внутриплощадочные сети связи, инв. № 11010562 и № 12030035), АТС БЕТА М5 № 1749 ТАИС.465235.012-02 (инв. № 25020008), объекты растительности: клен серебристый, 5 шт. (инв. № 20054001), каштан конский (инв. № 20054004), липа мелколистная, 2 шт. (инв. № 20058473), туя западная, 5 шт. (инв. № 20054006), газоны, 2 шт. (инв. № 20058579)

***Сведения о земельных участках,*** предоставленных продавцу для размещения объектов иного назначения:
1) на праве временного пользования пл. **1,94 га (**срок действия по 31.08.2029). ***Ограничения (обременения)*** прав на зем. участок: расположен в водоохран. зоне; в охран. зона линий связи и радиофикации (пл. 0.0268 га), в охран. зонах электрич. сетей (пл. 0,0339 га), зонах сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,4485 га), канализации (пл. 0,1234 га), теплоснабжения (пл. 0,0322 га), объектов газораспределит. системы (пл. 0,0975 га), недвиж. матер. историко-культур. ценностей (пл. 0,3730 га);
2) на праве долевой аренды (срок действия по 31.03.2026) для размещения технологич. котельной пл. **0,0991 га** с ограничениями

**Обременения по лоту № 2:** площади зданий частично сданы в аренду. Здание с инвентар. номером 500/С-53298 находятся в залоге у банка. Более подробную информацию по залогу и арендаторам можно узнать у организатора аукциона.
Продавец гарантирует освобождение капитального строения (производственный корпус), инв. № 500/С-45217 в течение 36 месяцев

**Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 19 257 564,00 бел. руб.**

**Обременения по лотам:** в соответствии с градостроит. проектом детального планирования, на зем. участках, на которых расположены предметы аукциона, предусмотрено размещение объектов торгово-развлекат., выставочно-музейного, музейно-просветит. назначения

**Задаток 1 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **20** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся повысить начальную цену на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **0,07 %** от цены продажи лота в течение 3 (трех) дней после проведения аукциона.
Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов: www.cpo.by

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 12.01.2022

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **01.03.2022 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **28.02.2022 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by**

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Завод горного воска» (Продавец)

**Лот № 1:** Легковой вагон VOLKSWAGEN MULTIVAN, кузов (рама) № WV2ZZZ7HZAH237095, 2010 г. в.
Начальная цена с НДС – 24 624,00 руб. Задаток – 2 500,00 руб.

**Лот № 2:** Седельный тягач МАЗ МАН 640268, кузов (рама) № Y3N64026880000032, 2008 г. в.
Начальная цена с НДС – 12 960,00 руб. Задаток – 1 296,00 руб.

**Местонахождение Лотов № 1 – № 2:** Минская область, Пуховичский район, г. п. Свислочь, ул. Партизанская, д. 2.

**Аукцион состоится 22.03.2022 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатков – **18.03.2022 в 11.00.**

**Организатор аукциона: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, ☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

23 марта 2022 года в 11.00 состоится годовое общее собрание акционеров ОАО «Элегант».

ПОВЕСТКА ДНЯ

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности общества за 2021 год и основные направления деятельности общества в 2022 году.
2. Отчет наблюдательного совета общества.
3. Утверждение годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности общества за 2021 год.
4. О выплате дивидендов и утверждение распределения прибыли и убытков общества за 2021 год.
5. Утверждение основных направлений использования прибыли в 2022 году и первом квартале 2023 года.
6. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.
7. О материальном вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.

Место нахождения ОАО «Элегант»: г. Гомель, ул. Интернациональная, 13-1.

Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Интернациональная, 13-1.

Время регистрации участников собрания в день проведения собрания с 10.30 до 11.00 по предъявлении документа, удостоверяющего личность (для представителя акционера – доверенность).

Список акционеров для участия в собрании будет составлен на основании реестра акционеров по состоянию на 23 февраля 2022 г.

Акционеры могут ознакомиться с материалами по вопросам повестки дня собрания в рабочие дни с 11.00 до 13.00 , начиная с 02.03.2022 г., по месту нахождения общества.

УНН 400078331

Наблюдательный совет.

## ОАО «Витебсклес»

**извещает акционеров о проведении очередного собрания акционеров 18 марта 2022 года в 11.00 по адресу: г. Витебск, ул. Ленинградская, д. 119-А**

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2021 год и определение основных направлений деятельности Общества в 2022 году.
2. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссии финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2021 год.
3. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков Общества за 2021 год.
4. Распределение прибыли Общества за 2021 год.
5. О направлениях использования прибыли Общества за 2022 год и в 1-м квартале 2023 года.
6. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.

С материалами собрания акционеры могут ознакомиться по месту нахождения Общества (г. Витебск, ул. Ленинградская, 119А, приёмная) в рабочие дни в период с 08 марта по 17 марта 2022 года с 9.00 до 16.30, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 1 марта 2022 года.

Регистрация участников собрания проводится с 9.30 до 10.45 по месту проведения собрания. Участникам собрания при себе иметь документ, удостоверяющий личность, а для представителей акционеров – и доверенности.

**Справки по тел. 8 (0212) 26 29 66.**

УНП 300029146

В **суд Лепельского района Витебской области** поступило заявление об объявлении умершим БАРАНКОВА Аркадия Аркадьевича, 21 ноября 1961 года рождения, уроженца д. Слидчаны Чашникского района Витебской области, последнее известное место жительства: Витебская область, Лепельский район, аг. Черейщино, ул. 60 лет Колхоза, д. 13. Место пребывания неизвестно.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим какие-либо сведения о Баранкове А.А., сообщить их суду Лепельского района Витебской области в течение двух месяцев со дня публикации.

Первичная профсоюзная организация частного производственного унитарного предприятия «Алюмвуд Групп» прекращает деятельность в связи с прекращением хозяйственной деятельности организации и отсутствием членов профсоюза, состоящих на профсоюзном учете.

Требования кредиторов могут быть заявлены в течение 2 месяцев с момента опубликования настоящего сообщения по адресу: 220121, г. Минск, ул. Бельского, д. 6, пом. № 1Н, оф. № 8.

УНП 100799172

# У СЛАЎГАРАДЗЕ СТВАРАЮЦЬ ПАРК ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ

## НА ЗЛІЦЦІ ДЗВЮХ РЭК

Калі глядзіш з высокага стромкага берага ўдалечыню, можна амаль фізічна адчуць палёт — так дзейнічае прыгажосць тэтэйшых краявідаў. Унізе бурліць, зліваючыся ў адну шырокую плынь, імклівая Сож і Проня, за імі рассцілаецца вялікі, наколькі хапае вачэй, маляўнічы луг, і далёка-далёка на гарызонце нібы шчытом ахоўвае гэты вечны пакой высокі калматы лес. Здаецца, раскінуў бы крылы і, як марыла Кацярына з «Навальніцы» Астроўскага, паляцеў. Ёсць у гэтым месцы нешта магічнае, што кліча вяртацца сюды зноў і зноў. Сама назва — Замкавая гара — надае парку таямнічасць. Ён працягнуўся ўздоўж берагавой лініі на кіламетр. З аднаго яго боку прыстань, з другога — аглядальная пляцоўка з вялікім якарам на пастаменце. Калісьці тут было дастаткова сур'ёзна развітае суднаходства. Кажуць, што прыбліжаныя Кацярыны Вялікай — князь Рыгор Пацёмкін, якому яна падарыла Крычаў, Аляксандр Галіцын, якому дастаўся Слаўгарад, і граф Пётр Румянцаў — уладальнік Гомеля, нават будавалі планы, як выкарыстоўваць для расійскага флоту тутэйшы лес. Сож — якраз тая рака, якая злучае ўсе тры гарады.

Але сёння парк перажывае не найлепшыя часы. Замка, які тут калісьці знаходзіўся, на жаль, даўно ўжо няма. Тую пляцоўку, дзе ён стаяў і адкуль адкрываецца захапляльны дух від на наваколле, слаўгарадчане называюць месцам для закаханых. Каля ліпы, дзе, як сведчыць гісторыя, пакінула надпіс Кацярына II, калі гасцявала ў Галіцына, любяць прызначаць сустрэчы. Пасярод круглай па форме паляны, дзе нават праз стагоддзі не растуць дрэвы (магчыма, з-за глыбокіх падвалаў, пра якія тут ходзіць шмат легендаў), велічэзны камень з шыльдачкай, дзе пералічаны ўсе варыянты назвы Слаўгарада. З-за каменя выглядае металічная фігура апошняга ўладальніка палаца, які, як сведчыць гісторыя, яго і сапраўды прапіў. На паляне ёсць таксама карэта і арыгінальна аформленае месца для пацалункаў. Усё гэта з'явілася некалькі гадоў таму, калі Жылкамгас у рамках праектнай дзейнасці паклаў пачатак акультурванню парку. Але гэтае месца патрабуе чагосьці больш грунтоўнага. Каб выратаваць жамчужыну Беларусі (у савецкі час парк уваходзіў у спіс найлепшых у маштабах краіны), мясцовыя ўлады шукаюць крыніцы фінансавання. Датацыйны горад, моцна абпалены Чарнобылем (адзіны з райцэнтраў Магілёўшчыны, які трапіў у зону радыеактыўнага забруджвання да 5 кюры) самастойна нешта сур'ёзнае не пацягне.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## ДУХ ТЫСЯЧАГОДДЗЯЎ

Памятаеце песню Уладзіміра Высоцкага пра час? «Замок временем срыт и укутан, укрыт / В нежный плед из зеленых побегов, /Но развяжет язык молчаливый гранит — / И холодное прошлое заговорит / О походах, боях и победах...»

Нядаўна ў Слаўгарадзе пабываў **беларускі скульптар Іван АРЦІМОВІЧ.** Прызнаецца, што быў нечакана ўзрушаны.

— Месца ну проста выдатнае, — не хавае ён эмоцый. — Калі хадзіў па гэтым парку, быў у захапленні. З 20-метровай вышыні адкрываецца неверагодна прыгожы краявід. Вельмі незвычайны ландшафт і, што самае галоўнае, адчуваецца дух тысячагоддзяў, даўніны, якая існавала яшчэ да таго, як гэтае месца было згадана ў летапісных крыніцах.

Суразмоўнік лічыць, што абмяжоўвацца адным толькі гістарычным перыядам, у прыватнасці, ваенным, на які мясцовая ўлада робіць акцэнт, было б няправільна. Гэтая тэрыторыя абавязкова павінна быць уладкавана ў адпаведнасці з усімі тымі эпохамі, у якіх яна існавала. Бягучы год, які праходзіць пад знакам гістарычнай памяці, абавязвае да гэтага. Павінна быць увекавечана ў тым ліку і тая гісторыя, якая схавана.

Войны, адраджэнне, росквіт — старажытны Прапойск-Слаўгарад перажыў у поўнай меры ўсе тыя выпрабаванні, што і краіна ў цэлым. І нават пасля самых трагічных падзей жыццё вярталася сюды.

— Мы даўно выношвалі ідэю рэканструкцыі парку, — кажа **старшыня Слаўгарадскага райсавета Святлана ЯЗЕРСКАЯ.** — Гэтыя алеі яшчэ памятаюць славутых гістарычных асоб, якія тут хадзілі. Наш парк жывы, дыхае гісторыяй, мінулым Слаўгарадчыны. Цяпер працуем над канцэпцыяй рэканструкцыі. Для нас гэты парк — наша мінулае і сучаснае, якраз тое, што ўвасабляе ў сабе словазлучэнне — гістарычная памяць.

## МЕСЦА СМУТКУ І СЛАВЫ

У парку пахаваныя вызваліцелі Слаўгарада ў Вялікай Айчыннай вайне. Менавіта па парку праходзіла нямецкая лінія абароны. Яна была зламаная толькі цаной вялікіх чалавечых ахвяр. Вада ў рацэ, кажуць, была чырвонай ад крыві забітых. А тое самае месца, якім у сённяшні час хочацца любавацца бясконца, для чырвонаармейцаў было полем смерці. З высокай гары, дзе стаялі нямецкія пушкі, на іх бесперапынна ліўся смяротны агонь.

Старажытны парк памятае і тое, як пад яго векавымі дрэвамі расстрэльвалі падпольшчыкаў і партызанаў. **Ветэран і былы настаўнік Пётр Іванавіч СТАРАВОЙТАЎ** бачыў гэта на свае вочы. Яму было ўсяго 16 гадоў, калі гітлераўцы схапілі яго і некаторы час трымалі ў камендатуры — двухпавярховым будынку на краі парку.

— Аднойчы я неасцярожна сказаў свайму таварышу, што ў мяне ёсць зброя для партызанаў, — успамінае ён. — Калі чырвонаармейцы адступалі, я збіраў і хаваў вінтоўкі ад забітых. Нашу размову пачулі і данеслі акупантам.

У адным з маленькіх памяшканняў нямецкай камендатуры, акрамя Пятра Старавойтава, трымалі яшчэ пяць жанчын і мужчын. Аднойчы да іх кінулі жонку партызана. На наступны дзень яе расстралялі ў парку і спіхнулі ў роў. Падобныя аперацыі тут праводзіліся рэгулярна.

Памятае ветэран і той самы палац, дзе некалі гасцявала Кацярына Вялікая. Да вайны будынак яшчэ стаяў на высокім беразе.

— Гэта быў двухпавярховік з адкрытай пляцоўкай наверсе, — кажа ён. — Мы з хлопцамі там лазілі, каб паглядзець на луг. Любавацца можна было бясконца. Але немцы разбурылі той палац.

— Вайна — гэта страшнае гора, — кажа ветэран. — Яна нясе смерць і разбурэнне. Мяне вельмі ўсцешыла тое, што ў парку будзе дастойнае месца памяці ахвяр. Трэба, каб моладзь цаніла мір і ніколі не забывала пра тое, як пакутаваў наш народ. Я перажыў нямецкі палон, цудам застаўся жывы. Вайна забрала двух маіх братоў, яшчэ два вярнуліся дадому інвалідамі.

## ТРЫ ДАМІНАНТЫ

Для супрацоўнікаў раённага гісторыка-краязнаўчага музея вельмі важна, каб гэты комплекс пад адкрытым небам з'явіўся. Ён будзе жывой ілюстрацыяй да тых экспанатаў, якія захоўваюцца ў музеі.

— У парку сканцэнтраваная ўся гісторыя нашага краю, з пачатку з'яўлення населенага пункта да сучасных дзён, — кажа **дырэктар музея Святлана МЕЛЬЯНЦОВА.** — Асноўныя дамінанты тры. Гэта старажытны перыяд, калі старадаўні Прапойск быў фарпостам спачатку Смаленскага княства, потым ВКЛ, другі росквіт мястэчка перажыло ў часы Расійскай імперыі, калі ўладальнікам тутэйшых зямель быў князь Аляксандр Галіцын, у XX стагоддзі страшным выпрабаваннем для нашага горада, як і ў цэлым для краіны, стала Вялікая Айчынная вайна. Нядаўна мы сабралі вялікі матэрыял па генацыдзе мірнага насельніцтва, і там вельмі шмат новых жахлівых фактаў, пра якія мы амаль нічога не ведалі.

Супрацоўнікі музея кажуць, што апошнім часам моладзь усё большую цікавасць праяўляе да гісторыі, у тым ліку савецкага перыяду. Экспазіцыя «Захоўваючы памяць на вякі» — якраз экскурс у тое, здаецца, яшчэ зусім нядаўняе мінулае. На старых фота — героі таго часу. Сярод іх беларускі жывёлавод, канявод, актыўны ўдзельнік калгаснага будаўніцтва Мікіта Ермалаевіч Батоўкін, дэпутат ад народа.

— У музеі Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску ёсць невялікая экспазіцыя, прысвечаная нашаму славутаму земляку, — з гонарам кажа **старшы навуковы супрацоўнік Вера СТАСЕНКА.** — Савецкая ўлада дала яму магчымасць з батракоў стаць вядомым чалавекам.

У раёне развіваецца пошукавы рух. Старшы навуковы супрацоўнік музея Андрэй Кавалёў з'яўляецца кіраўніком пошукавай групы «Спадчына». Сярод музейных экспанатаў ёсць і тыя, што былі знойдзены на месцы былых баёў.

Некалькі гадоў таму каля вёскі Рудня пошукавікі паднялі байца, пры якім быў фрагмент газеты «Камсамольская праўда» ад 27 лістапада 1940 года. На жаль, імя чырвонаармейца ўстанавіць не атрымалася, а вось газета, што ляжала ў яго кішэні, — цяпер у музейнай экспазіцыі. Вера Стасенка звяртае ўвагу на працоўную дату — 25 лістапада, якая згадваецца ў тэксце. Менавіта ў гэты дзень 1943 года і быў вызвалены Слаўгарад. У гісторыі, як той казаў, нічога выпадковага не бывае.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

*г. Слаўгарад.*

Старыя рэліквіі

# ДЫХАННЕ БЛАКАДНАГА ЛЕНІНГРАДА

**У гэтай паштоўкі, якая намалявана ад рукі, не надрукаваная, і па ўсіх законах «жанру» не з'яўляецца знакам паштовай аплаты, — свой ваенны лёс. Да мяне яна трапіла ад калекцыянера Алега Аляксандравіча СУДЛЯНКОВА. Паштоўка датавана 15 лютага 1943 года...**




Блакада Ленінграда ў Вялікую Айчынную вайну, як вядома, доўжылася з 8 верасня 1941-га да 27 студзеня 1944-га. 18 студзеня 1943 года было прарвана блакаднае кольца. Усяго «век» блакады — 872 дні... Пра пакуты, гібель людзей, увесь драматызм падзей у горадзе на Няве ў ваенны час напісана велізарная бібліятэка. Да стварэння яе спрычыніўся — супольна з класікам рускай літаратуры, пісьменнікам-франтавіком Даніілам Граніным — і наш пісьменнік-гуманіст Алесь Адамовіч. Іх «Блакадная кніга» — вечны помнік блакадзе і ленінградцам-блакаднікам!..

На першай старонцы паштоўкі: «ПОЧТОВАЯ КАРТОЧКА. CARTE POSTALE». Ніжэй: «Куда...» І ад рукі — вялікімі літарамі: «Ленинград». Яшчэ ніжэй: «Кому...» Ізноў ад рукі: «Петроградская Сторона Гатчинская ул., д. 7, кв. 10, Андрею Ивановичу Таран». Зусім унізе адным радком: «Д. И. Митрохин Каз ССР Алма-Ата Просп. Фурманова 115 кв. 12».

На другім баку — тэкст: «15-II-1943

Дарагі Андрэй Іванавіч, атрымаў Вашу паштоўку ад 18-га студзеня. Гэты радасны, слаўны дзень ніколі не забудзецца, як светлы прарыў у нашу прыгожую будучыню; я ў думках быў з Вамі. Рады і таму, што мае лісты даходзяць і Вы на іх мне адразу ж адказваеце.

Я ўпэўнены, што цяпер у Вас усё пойдзе лепей і лепей. І Вы зможаце адпачыць і супакоіцца ад усяго горкага перажытога. Як здароўе Марыі Мікітаўны, ці добра яна пераносіць зіму? Шлю М.М. самыя сяброўскія пажаданні. Тут стаіць суровая зіма. Паліва няма, электрычнасць выключана, паравое ацяпленне — не дзейнічае. Але мы стараемся пры ўсіх пакутах не губляць бадзёрасці. Спадзяёмся дажыць да цёплых дзён і прыняцца за працу. Моцна цісну Вашу руку. Д. Мітрохін».

Слоў няшмат. Але і гэтай кароткай паштоўкай многае сказана. Праз дзесяцігоддзі пасля пакутлівых выпрабаванняў цана гэтых слоў становіцца яшчэ большай...

Крыху пра таварышаў па ліставанні... З Казахстана, з эвакуацыі, свайму калезе па рабоце ў выяўленчым мастацтве пісаў Дзмітрый Іванавіч Мітрохін (1883 — 1973), графік, ілюстратар кніг, майстра станковай гравюры, афорта, літаграфіі. Яшчэ ў 1908 годзе да ўдзелу ў выстаўцы «Свет мастацтва» ён быў запрошаны славутымі Аляксандрам Бенуа і Канстанцінам Сомавым. У 1932 — 1939 гадах Мітрохін узначальваў графічную секцыю Ленінградскага Саюза мастакоў. У 1941 годзе Мітрохін (а было яму 58 гадоў) уступіў у народнае апалчэнне. У 1942 годзе мастак быў эвакуіраваны ў Алма-Ату. З 1944 года Дзмітрый Іванавіч жыў у Маскве. Мітрохін праілюстраваў мноства кніг і часопісаў самых розных выдавецтваў. Сярод іх — творы Марыны Цвятаевай, Эдгара По, Віктора Гюго, Арыстафана, Анры Барбюса... Пра мастака яшчэ ў 1921 годзе выйшла кніга Усевалада Воінава «Кніжныя знакі Дз. І. Мітрохіна».

Інфармацыі пра мастака-жывапісца Андрэя Іванавіча Тарана (1886 — 1967) не так і шмат. Закончыў у 1906 годзе Пензенскае мастацкае вучылішча. У 1909 — 1912 гадах займаўся ў прыватнай акадэміі ў Парыжы. У 1911 — 1914 гадах у Парыжы працягваў авалодваць майстэрствам мастака наш Марк Шагал. Мо дзе і перасякаліся Шагал і Таран?.. У 1921 годзе Таран — загадчык Музея культуры жывапісу ў Петраградзе, прафесар манументальнай майстэрні Мастацка-дэкаратыўнага інстытута там жа. У 1923—1940 гадах — прафесар Кіеўскага мастацкага інстытута. У 1940-м вярнуўся ў Ленінград.

Два таленавітыя, сталага веку чалавекі, дзве асобы, якія, пэўна, і ў вайну захоўвалі свае дадзенае Богам мастацкае прадвызначэнне... Ім было няпроста яшчэ і з прычыны таго, што ў нечым талент павінен, абавязаны быў праяўляцца... І шчасце, што ў іх была магчымасць дзяліцца паміж сабой думкамі, суперажываць адзін аднаму, пра што і сведчыць старая, рукамі зробленая паштоўка. У ёй — дыханне эвакуацыйнай Алма-Аты, якая дала прыстанішча і беларусам, дзіцячаму пісьменніку Янку Маўру, і блакаднага Ленінграда...

**Кастусь ЛЕШНІЦА.**

## Кніжны гасцінец

# СВЯТЛО МЕСЯЦА, ПОЛЫМЯ ПРАЎДЫ

**Васіль Быкаў. Народная бібліятэка. Мінск, «Мастацкая літаратура», 2021.**




Новы выпуск серыі «Народная бібліятэка» прысвечаны Васілю Быкаву. Нагадаю, што незвычайны праект выдавецтва «Мастацкая літаратура» — выданні класікаў складаюцца паводле чытацкага выбару. Звесткі пра густы чытачоў збіраюцца з дапамогай бібліятэк. Улюбёных твораў Быкава назбіралася ажно на два тамы. Што ж трапіла ў «топ»? Аповесці «Знак бяды», «Абеліск», «Жураўліны крык», «Альпійская балада», «Дажыць да світання», «Сотнікаў». Па тры аповесці на том. Любая з іх — шэдэўр, узор экзістэнцыяльнай прозы сусветнага ўзроўню. Як Васіль Быкаў казаў пра аповесць «Сотнікаў», *«Перш за ўсё і галоўным чынам мяне цікавілі два маральныя моманты, якія, спрасціўшы, можна сфармуляваць так: «Што такое чалавек перад знішчальнай сілай бесчалавечых абставін? На што ён здольны, калі магчымасці абараніць жыццё вычарпаны ім да канца і прадухіліць смерць немагчыма?»* Тыя ж пытанні вырашаюцца ва ўсіх творах прадстаўніка «лейтэнанцкай прозы», пакалення франтавікоў, якія сказалі праўду пра вайну. Праўду, якая не ўсім, прывычным да афіцыёзу, падабалася. Таму вакол кожнага са згаданых твораў разгараліся дыскусіі. Напрыклад, Пятрусь Броўка патрабаваў змяніць наступнае: *«Вельмі прыкра, калі Рыбак вядзе Сотнікава на смерць. Можа, адзінкавы такі выпадак і быў, але гэта неўласціва нашаму партызанскаму руху. Можа, варта было б пазбегнуць гэтага, а калі не, дык было б добра, каб Рыбака (нягледзячы на яго пераход у паліцаі) усё роўна павесілі. А то выходзіць, што здрадніцтва, шкурніцтва перамагае»*. Больш глыбока прачытаў паказанае Алесь Адамовіч: *«Жудасная справа — «ліквідацыя» Сотнікава і іншых, з кім расправіліся фашысты ў маленькім беларускім гарадку. Але тое, што фашысты зрабілі з Рыбаком, — таксама «ліквідацыя»: яго пазбавілі чалавечага права ўжо не на жыццё, а нават на больш-менш прыстойную смерць».*

Тамы стыльна аформленыя, іх зручна чытаць — добрая папера, закладкі, трывалы пераплёт. Ну а ў Год гістарычнай памяці абавязкова варта звярнуцца да кніг, дзякуючы якім гэтая памяць захоўваецца.

**Аляксей Лосеў. Дыялектыка міфа. Выдавецтва «Азбука», Масква, 2021.**



«Усё на свеце ёсць міф», «Міф не ёсць выдумка ці фікцыя, не ёсць фантастычны вымысел».

Нічога сабе заява для 1930 года, у краіне, дзе абвешчаны адзінай прымальнай філасофіяй марксізм?

Але філосаф, знаўца антычнай культуры і перакладчык Аляксей Лосеў пісаў трактат «Дыялектыка міфа» без аглядкі на цэнзуру...

Не, там пачыталі, адрэдагавалі... Але аўтар пасля ўнёс дапаўненні, якія палічыў патрэбным. І яшчэ ў час падрыхтоўкі быў арыштаваны — занадта шмат шкодных думак...

Трактат, вядома, патрабуе пэўнай падрыхтоўкі ад чытача, але захапляльны, так і падбівае на рэфлексіі і дыскусіі. Неверагодная эрудыцыя, цікавыя прыклады і параўнанні, яркі, вобразны, трохі велягурысты стыль і палемічны запал.

*«Калі грэк не ў эпоху скептыцызму і ўпадку рэлігіі, а ў эпоху росквіту рэлігіі і міфа гаварыў аб сваіх шматлікіх Зеўсах ці Апалонах; калі некаторыя плямёны маюць звычай надзяваць на сябе каралі з зубоў кракадзіла, каб пазбегнуць небяспекі патануць, пераплываючы вялікія рэкі; калі рэлігійны фанатызм даходзіць да самакатавання і нават да самаспалення; — дык вельмі па-невуцку было б сцвярджаць, што міфічныя ўзбуджальнікі , якія тут дзейнічаюць, ёсць не больш як толькі выдумка, чысты вымысел для дадзеных міфічных суб'ектаў. Трэба быць да апошняй ступені блізарукім у навуцы, нават проста сляпым, каб не заўважыць, што міф ёсць (для міфічнай свядомасці, вядома) найвышэйшая па сваёй канкрэтнасці, максімальна інтэнсіўная і ў вышэйшай меры напружаная рэальнасць».*

Міф для Лосева ў самой свядомасці («многія, напрыклад, любяць крыўдзіцца»), у навуцы (паводле Ньютана свет аднародны і бясконцы, а гэта «чорная дзірка, нават не магіла і нават не лазня з павукамі»). Лосеў разважае аб вучэнні Гётэ пра колеры («Што датычыцца, напрыклад, мяне, то я ніколі не бачу проста жоўты колер... Жоўты колер утварае цёплае ўражанне і выклікае дабрадушны настрой»). А развагі пра святло месяца — гэта ўвогуле паэзія... *«Выйдзіце на луг, калі над вамі бязвоблачнае летняе неба і калі месяц адзін лунае ў вышыні, так што ні вецер, ні хмары, ні дождж, ні які-небудзь асаблівы стан атмасферы не адцягвае вашае ўвагі і вы можаце засяродзіцца толькі на месяцы. Гэтае месяцовае святло ў самай сутнасці ёсць нешта халоднае, сталёвае, металічнае...»*

Аўтар піша нават пра галасы ў сваёй галаве — напрыклад, падчас якой-небудзь лекцыі чуе, як густы бас цягне на адной ноце «Н-а-а-а-а-а-до-о-о-о-о-о-е-е-е-е-е-е-е-лоооoooo... На-аааааадоооооеееееловоо...»

Трактат быў упершыню выдадзены толькі ў 1990-х. Аляксей Лосеў памёр раней, хоць пражыў надзвычай доўгае і плённае жыццё. Як выказаўся адзін крытык, «Дыялектыка міфа» пакідае дзіўнае ўражанне, але ўтрымлівае надзвычай цікавыя разважанні.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.25 | 18.22 | 9.57 |
| Віцебск — | 8.18 | 18.09 | 9.51 |
| Магілёў — | 8.15 | 18.12 | 9.57 |
| Гомель — | 8.08 | 18.03 | 9.55 |
| Гродна — | 8.40 | 18.38 | 9.58 |
| Брэст — | 8.37 | 18.42 | 10.05 |

## Месяц

***Поўня 16 лютага. Месяц у сузор'і Дзевы.***

## Імяніны

***Пр.*** *Абрама, Аляксандра, Аляксея, Георгія, Івана, Кірылы, Мікалая, Сяргея, Фёдара, Юрыя.*
***К.*** *Сусаны, Аляксея, Лукаша, Расціслава.*



Фота Алены ДАЎЖАНОК.

# ЗАЎТРА




## Даты | Падзеі | Людзі

### 17 ЛЮТАГА

У краіне

**1387** год — згодна з прывілеем вялікага князя ВКЛ Ягайлы заснавана Віленская рымска-каталіцкая епархія, царкоўна-адміністрацыйная адзінка рымска-каталіцкай царквы, найстаражытнейшая на тэрыторыі Літвы і Беларусі.

**1837** год — нарадзіўся (в. Ляды, цяпер у Чэрвенскім раёне) Канстанцін Міхайлавіч Ельскі, беларускі вучоны-біёлаг, географ, геолаг, падарожнік. У 1860 годзе скончыў Кіеўскі ўніверсітэт. З 1865 года — у Французскай Гвіяне, з 1869-га — у Перу. Адкрыў від жывёліны Dinonys. Працаваў у Турцыі, Германіі і Францыі. З 1880 г. — у Кракаве: захавальнік прыродазнаўчых калекцый АН. Аўтар кнігі «Папулярна-прыродазнаўчыя апавяданні аб знаходжанні ў Французскай Гвіяне і часткова ў Перу». У гонар Ельскага названы адзін від лаўра і некалькі відаў птушак і звяроў.



**1900** год — нарадзіўся Фёдар Пятровіч Вінакураў, вучоны ў галіне гідратэхнікі, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі БССР, акадэміка АН БССР, акадэмік Акадэміі будаўніцтва і архітэктуры СССР. У 1954—1956 гадах — міністр меліярацыі і воднай гаспадаркі БССР. Распрацоўваў пытанні праектавання і будаўніцтва комплексаў гідратэхнічных збудаванняў, механікі тарфяных грунтоў. Аўтар праектаў і кіраўнік каля 20 будаўнічых комплексаў, якія маюць важнае народнагаспадарчае значэнне. Апублікаваў больш за 50 навуковых прац.

**1952** год — нарадзіўся (в. Хвалава Пружанскага раёна) Уладзімір Васільевіч Крываблоцкі, беларускі мастак-манументаліст. Аўтар героіка-патрыятычных манументальных кампазіцый: роспіс «У імя жыцця на Зямлі» ў Музеі народнай славы ў г. п. Ушачы, вітражы і мазаіка «Іаан Хрысціцель» у Свята-Пакроўскай царкве ў в. Чыжэвічы Салігорскага раёна і іншага. Аўтар манументальных карцін.

У свеце

**1867** год — нарадзіўся Пётр Пятровіч Шміт, рускі марскі афіцэр, рэвалюцыйны дэмакрат, адзін з кіраўнікоў Севастопальскага паўстання 1905 года. Па прапанове рэвалюцыйных матросаў узяў на сябе камандаванне крэйсерам «Ачакаў». Пасля жорсткай бітвы крэйсера і іншых караблёў з урадавай эскадрай паўстанне пацярпела паражэнне. Шміт быў аддадзены пад суд і прыгавораны да смяротнага пакарання.

**1877** год — нарадзіўся Андрэ Мажыно, французскі дзяржаўны дзеяч, генерал, ваенны міністр. Быў ініцыятарам стварэння лініі ваенных умацаванняў уздоўж франка-германскай граніцы (Лінія Мажыно).

**1932** год — англійскі фізік Джэймс Чэдвік адкрыў нейтрон (Нобелеўская прэмія за 1935 год). Пачатак сучаснай ядзернай фізікі.

Так гаварыла...

**ВАЛЯНЦІНА АКОЛАВА:**

*«А жыццё (хоць памры!) не пачнецца спачатку».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Акуратна пераходзяць дарогу толькі пешаходы з вадзіцельскім пасведчаннем.**

Нішто не раздражняе чалавека так, як усё.

**Наташа была настолькі халоднай жанчынай, што ў камара, які піў яе кроў, забалела горла.**

— Мужыкі! А давайце купім сабе шкарпэткі і пену для галення перад 23 лютага! Паставім сваіх жонак у тупік!

**Калі ўвосень нашмараваць дах згушчонкай, то ўвесну будуць смачныя ледзяшы.**

— Я яго з войска чакала, а ён прыехаў і нічога мне ў падарунак не прывёз — ні футра, ні айфона новага, ні пярсцёнка з брыльянтам...

— Вось зараза. Ім жа на дэмбель у казарме выдаюць і футры, і айфоны, і пярсцёнкі... Напэўна, загнаў камунебудзь, гад...

**Калі цяпер здаць у чыстку пухавік, можна выклікаць жорсткае пахаладанне.**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 403. Нумар падпісаны ў 19.30 16 лютага 2022 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12